Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2633) Год LI Беласток, 29 кастрычніка 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Глогер: Фіёнік, Кабац, Паўлючук

Лаўрэатамі ломжынскага конкурсу імя вядомага энтографа Зыгмунта Глогера сталі сёлета м.інш. Дарафей Фіёнік — кіраўнік Музея малой айчыны ў Студзіводах і Віктар Кабац, вядомы мастак і аніматар мастацкага жыцця. Прафесару Уладзіміру Паўлючуку на сцэне Агульнаадукацыйнага ліцэя імя Марыі Канапніцкай у Ломжы была ўручана грамата міністра культуры і нацыянальнай спадчыны. Уручэнне ўзнагарод імя Глогера праводзілася ўжо семнаццаты раз. Сёлета спалучалася яно з навуковай сесіяй і прамоцыяй кнігі з такой самай назвай: *Polska i jej sąsiedzi* пад рэдакцыяй якраз прафесара Паўлючука. Сёлета ўрачыстасць сышлася з 25-годдзем Прэсазнаўчага згуртавання „Стопка", якім ад пачатку кіруе Станіслаў Загурскі. Пачэсны камітэт узнагароды ачольваў вядомы гісторык праф. Януш Тазбір.

Злева: Віктар Кабац, Дарафей Фіёнік, Уладзімір Паўлючук

У другі дзень глогераўска-стопкавага свята Дарафей Фіёнік, Віктар Кабац і спадарожнічаючая ім Аліна Дэмбоўская, кіраўнік Музея ў Бельску-Падляшскім, вельмі хацелі аддаць пашану Зыгмунту Глогеру. Ніхто, аднак, з распытваных у цэнтры Ломжы не ўмеў сказаць, дзе стаіць ягоны помнік. Тады вось лаўрэаты і спадарыня кіраўнік падаліся на ўрачыстасць, сесію і прамоцыю кнігі ў мясцовы ліцэй.

Лаўрэат Дарафей Фіёнік, атрымаўшы ўзнагароду III ступені, сказаў „Ніве":

— Я ніколі не спадзяваўся, што чакае мяне ў Ломжы такая прэстыжная ўзнагарода. Яна не толькі мая, але і асоб, без якіх я столькі не змог бы зрабіць. Я ўжо бачу, што некаторыя справы магу перадаць іншым. Наш музей стаў адметнасцю Бельска. Удалося мне давесці да таго, што з нашай хаткі Кандрацюкоў узнік музей, дзе можам пахваліцца цэлай серыяй выданняў і гуртом, які як адзіны займаецца аўтэнтычным рэпертуарам бельскіх і гайнаўскіх беларусаў, дзякуючы сабраным імі запісам. Намерваемся і сабраны фальклор, і гэтых жа людзей запісаць на відэастужку.

У сваю чаргу Віктар Кабац, вылучаны ў конкурсе, прызнаўся нам:

— Гэтая ўзнагарода настолькі прыемная, што пры грамадскіх акцыях падобных гэтай мастакі недаацэньваюцца і ўвогуле пра іх замоўчваецца. Мне вельмі прыемна, што тут у Ломжы якраз мяне з нашай Гайнаўкі прыкмецілі і маё мастацтва высока ацанілі.

Яшчэ да ўручэння ўзнагарод праф. Януш Тазбір успамінаў:

— Галоўны папрок у адрас Польшчы наконт нашых стасункаў з суседзямі гэта тое, што мы кіруемся антыпатыямі. Ды ж такое здараецца не толькі ў Польшчы.

І дадаў тонам, выклікаючым рознагалоссе:

— Залішне ў песімізм ідуць тыя, хто кажа, што змена рэлігіі, нацыянальнасці становіцца чымсьці благім ці вартым зганьбавання. На зыходзе XXI стагоддзя так і будзе, але ці памяняецца наша тоеснасць?

Пасля ў размове з „Нівай" праф. Тазбір адзначыў:

— Беласточчына стане беларускім П'емонтам. У польска-беларускіх стасунках няма трупаў, „шкілетаў у шафе". Няма чаго адны адным дараваць, як гэта ёсць у польска-ўкраінскіх адносінах. Гэта акалічнасць, якая паказвае на магчымасць наладжання сяброўскіх, больш блізкіх кантактаў. Я мушу адзначыць, што палякі не цанілі і значная іх частка таксама не цэніць беларускіх здольнасцей стварыць уласную дзяржаўнасць. На шчасце даходзіць гэта да свядомасці палякаў у штораз большай ступені.

Дарафей Фіёнік узнагароджаны ў Ломжы

У час сесіі Дарафей Фіёнік тлумачыў:

— Маё Падляшша, мая бацькаўшчына, гэта перш за ўсё круг мясцовасцей, звязаных з радаводамі продкаў. У большасці мясцовасцей, распаложаных на ўсход ад шашы Бельск — Сямятычы, пражываюць мае сваякі. Тут амаль усе, у бліжэйшым ці далейшым пакаленні, радня. Гэта адзін вялікі род, з адной мовай у розных дыялектах і з адной верай.

Пасля дадаў:

— Бельск, ад канца XVIII стагоддзя званы Падляшскім, гэта горад своеасаблівы ў маштабе ўсяе цяперашняй Польшчы. Тут актыўная ***двухкультурнасць*** — заходняй і ўсходняй славяншчыны — з'яўляецца нагодай не толькі да канферэнцыйных ці фэставых гаворак. Тут двухкультурнасць з'яўляецца рэальнай пачатковай сілай для шмат якіх дзеянняў у сферы духоўнасці горада і яго ваколіц. Тут двухкультурнасць дзьме ў крылы здаровай творчай канкурэнтнасці, саперніцтву — хто зробіць лепш і больш... Ды час ад часу выклікае нездаровае падкусванне.

Прытым Фіёнік сказаў, што не любіць — асабліва ў кантэксце Бельска — слова *шматкультурнасць* і, — лепш у гэтым выпадку прымяняць паняцце *двухкультурнасці*.

На канец сесіі ўзяў голас праф. Уладзімір Паўлючук:

— Аб суседзях з Усходу мы не ведаем анічога, а нават менш нуля, значыць, таго, чаго проста няма.

У кнізе *Polska i jej sąsiedzi*, якая стала зачаткам для сарганізавання сесіі, шмат месца прысвячаецца пытанням беларушчыны і польска-беларускіх адносін. Аўтарамі тэкстаў з'яўляюцца м.інш. Уладзімір Паўлючук, Сакрат Яновіч ды вядомы з выступленняў на сустрэчах Вілы Сакратас Рышард Радзік. Аб згаданай кнізе неўзабаве напішам.

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

Бельск-Падляшскі
Бельскі дом культуры
Пятніца [27.X] 18.00
- Кацярына і Мажэна Жменька
- Ілo з сябрамі
- Кроў

Гайнаўка
Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка"
Пятніца [27.X] 18.00
- Лявон Вольскі

Бельскі дом культуры
Субота [28.X] 18.00
- Алег Кабзар
- Лявон Вольскі
- Віктар Шалкевіч

Польскае Радыё Беласток
Нядзеля [28.X] 18.00
Канцэрт-live ў эфіры радыё
- Ілo з сябрамі
- Віктар Шалкевіч

25-ГОДДЗЕ БАСу

Беларускае аб'яднанне студэнтаў аб'яўляе:

Юбілей будзем святкаваць 24 лістапада 2006 г. у Фальварку Надаўкі, што каля скансэна (дарога з Беластока на Аўгустаў), пачатак у 18 гадзін. Усіх БАСаўцаў шчыра запрашаем пацвярджаць прыбыццё па каардынатах:

тэл./факс +48 85 743 50 22
тэл. +48 507 08 08 07
mail: biuro@basowiszcza.org

Неўзабаве падрабязней пра праграму святкавання, якое будзе праводзіцца з 16 па 25 лістапада 2006 года.

Спадару Янку Целушэцкаму
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора — смерці Маці — выказвае рэдакцыйны калектыў „Нівы".

Сіла гумару

Калісьці адзін з савецкіх дысідэнтаў заўважыў, што ў краіне, дзе няма палітычнай апазіцыі, апазіцыяй становіцца мастацкая літаратура. У прыватнасці, надрукаваная і памножаная дысідэнцкая думка, даведзеная да суайчыннікаў праз мастацкія вобразы. Другой галіной апазіцыйнасці з'яўляецца гумар. Менавіта таму ў часы СССР анекдоты сталі самым папулярным жанрам вуснай народнай творчасці. Практычна кожны новы дзень на кожным працоўным месцы пачынаўся са свежага анекдота. Так грамадзяне таталітарнай краіны ратаваліся ад шэрай і занудлівай, даведзенай да поўнага абсурду, афіцыйнай прапаганды, якая з дня ў дзень талдоніла пра нашае самае шчаслівае дзяцінства, самае вартае юнацтва і самае заможнае жыццё ўвогуле. Таму калі ў некага была пустая лядоўня, то чалавеку раілі ўключаць лядоўню ў разетку ад радыё. Тады, казалі, лядоўня адразу стане поўнай. Бо па радыё кажуць, што ў нас усяго хапае, хоць заваліся.

Гэтыя дзве галіны апазіцыйнай творчасці ішлі нага ў нагу доўгі час без належнай кампаніі, пакуль ім на дапамогу не прыйшла трэцяя, таксама унікальная па свайму складу, вельмі гумарыстычная. І самае смешнае тое, што галоўнымі носьбітамі і распаўсюджвальнікамі яе былі афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі. Асабліва тэлебачанне. Застрашаныя да паўсмерці стваральнікі прапагандысцкіх праграмаў і дыктары савецкага тэлебачання, якіх за кожную няправільна вымаўленую літару жорстка каралі, так далёка зайшлі ў сваёй баязлівасці, прыслужлівасці рэжыму і халуйстве, што стараючыся паказаць рэальнасць адваротную сапраўднай, залгаліся ўшчэнт і ператварылі праграмы інфармацыйных паведамленняў у гумарыстычныя выступы, з якіх смяялася ўся самая вялікая краіна ў свеце і ўсе нацыі ды народнасці насяляючыя яе.

Прынамсі гэта быў паказальнік таго, што тая дзяржава ўжо наблізілася да свайго скону і, калі з існуючага рэжыму ўжо стаў смяяцца ўвесь народ, то нішто яе не ўратуе. Так і сталася. Ды Бог з ёй, з той дзяржавай. Лепш пагаворым, як кажуць, пра нашых бараноў. Ці калі выславіцца не алегарычна а канкрэтна, то пра нашых кароў.

Нічога асаблівага як бы і не сталася. Пасвіліся сабе беларускія кароўкі на сакавітым лузе, траўку скублі, нікому нічога благога на рабілі. А па той бок мяжы, на Падляшшы, тое ж самае рабілі адкормленыя пародзістыя бычкі. І таксама нікога не чапалі. Ну дык гарачыя беларускія самкі кінуліся да тых быкоў праз мяжу, без візаў і анкетаў, пераламалі ўсе памежныя загародкі і падпарадкаваліся інстынкту размнажэння. На жывёлу чаго наракаць. Яна ж не дурная і разумее, што ўсе межы і памежныя зоны, забароны ды перашкоды людзі прыдумалі для сабе падобных істотаў і каровы гэтыя правілы выконваць не мусяць. Тым больш, што за гэта ніхто іх не аштрафуе і ў астрог не пасадзіць. Вось і пакарысталіся сваёй прывілеяй. Факт натуральны. І ніхто не звярнуў бы ў другой краіне на гэта ўвагу. Ды толькі не ў Беларусі.

Першымі былі расійскія „тэлевізіёншчыкі". Яны з радасцю расказалі пра гэтую гісторыю, пачаўшы свой рэпартаж словамі, што ад Лукашэнкі каровы ўцяклі за мяжу. Пры чым тут Лукашэнка, ніхто канкрэтызаваць не стаў. І тады ўжо беларускія калегі тых расійскіх рэпарцёраў вырашылі, як і іх былыя савецкія тэлерадыёагітатары, што мусяць падаць гэты факт у сваёй інтэрпрэтацыі. А назаўтра ўсе людзі толькі пра гэта і гаварылі. Больш гумарыстычнай перадачы яшчэ не было. Пасмяяліся на славу.

Пачаўся рэпартаж з таго, што беларускі прэзідэнт змагаецца на міжнародным узроўні супраць сексуальнага рабства. Пасля паказалі тых сексуальна заклапочаных кароў. А закончылі тым, што лепш бы Мілінкевіч і Кулей тых кароў, а не апазіцыйную моладзь, узялі вучыцца ў польскія навучальныя ўстановы. Маўляў, было б больш толку, бо каровы, у адрозненні ад апазіцыянераў, не п'юць гарэлкі.

Цяпер, кажуць людзі, кожны дзень трэба спяшацца дахаты, каб, уключыўшы тэлевізар, забыцца пра шэрыя будні і ад душы пасмяяцца. Тэлебачанне стала гумарыстычным, як у тыя часы перад сконам СССР.

Віктар САЗОНАЎ

Кланіраванне масы

Святкаванні юбілею „Нівы" былі добрай зачэпкай для агляду яе не толькі ў пампезным аспекце, але таксама і крытычным. На хвалях радыё пачуў я мініапытанне маладых людзей пра наш тыднёвік. Выказванні былі агульна крытычныя, асабліва таму, што змест газеты не супадае з цяперашнімі маладымі спадзяваннямі — замалая ўвага адводзіцца музыцы, а завялікая неспрактыкаванай імі гісторыі. Што матэрыялы напісаны непрафесійна, што яны задоўгія і яшчэ, здаецца, крыху іншых заган.

Калі б у цяперашнім стэрыльным цывілізаваным свеце быў дзе попел, дык я адразу каяўся б з гэтага і пасыпаў бы сабе тым попелам галаву, бо ж у гэтых — як жа слушных — недахопах, напэўна, ёсць і мой удзел, *mea culpa*. Ударыўся я толькі ў грудзі і стаў разглядацца за ідэалам. Хаця ідэал, як сведчыць сама этымалогія, гэта толькі прадукт ідэі, але ж можа ён, як і тая папараць-кветка, недзе ёсць у сапраўднасці, можа ён акурат дрэмле побач нас.

Спытаў я сам сябе: ці можна рабіць такую газету, якая некага поўнасцю задавальняла б? І адказ атрымаўся ў мяне станоўчы: можна! І далей: ці можна рабіць такую газету, якая б поўнасцю задавальняла нейкі лік чытачоў? Таксама можна, пры ўмове, што ў тых чытачоў аднолькавы псіхічны Gestalt (ням.: структура). А такіх ад прыроды не бывае, кожны па-асабліваму розны.

Але вось тыя нашы крытычныя чытачы падалі след, што ёсць такія прэсавыя выданні, якія ім падабаюцца. І што тыя выданні падабаюцца не толькі ім. І гэта праўда, бо сам бачу ў найбольш экспанаваных вітрынах кіёскаў такія газеты.

Ці гэта не парадокс, што я так сабе бестурботна выказваюся за адначасную праўдзівасць і непраўдзівасць разглядаемага канкрэтнага аспекту? Парадокс быў бы, калі б разглядаўся чалавек ад прыроды. Але вось чытач газеты гэта ж чалавек цывілізаваны, не ад прыроды. Яму ўжо закладзены своеасаблівы псіхалагічны гештальт, які, агульна кажучы, у шмат якіх людзей атрымліваецца вельмі падобны, а часам нават ідэнтычны. Першабытны чалавек бачыў вакол сябе канкрэтную прыроду, цяперашні чалавек бачыць перад сабою экран. Наш чалавек, мяркую, найчасцей глядзіць тэлебачанне. І ён такі не адзін, іх такіх многа, якія глядзяць тое самае тэлебачанне, у іх ад пабачанага складваецца аднолькавае бачанне свету, масавае, пазбаўленае індывідуальнасці. І гэтую масу можна задаволіць, падаючы ёй масавы змест не толькі ў тэлебачанні, але і ў газетных выданнях, накіраваных масаваму спажыўцу. І гэтыя газеты вельмі выгадныя: у іх, як у тэлевізары, каляровыя карцінкі, а змест складаецца з вельмі вялікіх і вельмі малых літар. Вялікія літары вызначаюць шык, іх трэба прачытаць. А малыя літаркі чытаць неабавязкова, яны толькі для недаверкаў, якім захочацца даследаваць ці загаловак праўдзівы. І яшчэ адзін козыр загалоўкавых выданняў: у іх за вялікімі загалоўкамі не астаецца месца на складаныя праблемы, якія ўсё-такі нясе нават штораз выгаднейшае жыццё — у іх няма доўгіх праблемных тэкстаў, якія трэба часа і працаёмка чытаць. Яны чытача не трывожаць, яны ўспакойваюць, яны — тэрапеўтычныя! Іх чытач не фарсіруе (ад слова *force* — сіла; дзейнасць, якая патрабуе высілку) як прыроднай палявой дарогі з калдобінамі, але выгадна імчыць як па амерыканскай (*american dream!*) аўтастрадзе. Ці ж прыходзіцца дзівавацца, што такія выданні даспадобы масаваму цывілізаванаму чытачу?

А „Ніва"? Тут шмат нецікавай маладому чытачу старыны; яна нецікавая і выгаднаму пажылому чалавеку. Але ўсе факты, нават тыя, пра якія ў масавых выданнях масаваму спажыўцу, гэта ж таксама старына, толькі рэлятыўная. І хаця ніўскія даўніны невіртуальныя, аднак менавіта рэальная гісторыя — так мне здаецца — вызначае культуру. А культура, шырэйшы і паўнейшы агляд свету, патрабуе высілку, патрабуе выхіліцца звыш масы і сваім — не тэлекамеры — вокам глянуць навонкі паказваных масам малюнкаў. Культура элітарная, не снобская, за ёю неабавязкова гнацца за трыдзевяць зямель. Цывілізацыя не заўсёды супадае з культурай, хаця намагаецца ёю прыкідвацца.

Кланіраванне чытача сродкамі масавай (!) інфармацыі стварае з яго менавіта масу, такую гладкую і аднародную, як цёмная бітумічная маса, як асфальт. І маса тады масай, калі яе многа, калі яна дасягае крытычнай масы, прынамсі мільёнаў. А ў нашых умовах іх няма, няма з чаго набіраць масы. І цывілізацыйны працэс захоплівае нашы неўкаранелыя тысячы, дзесяткі, адзінкі ў іншыя масавыя плыні. А калдобістая „Niwa", wiocha — to sprawa nie dla mięczaków.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Культурная метраполія?

Як гэта ў час выбарчай кампаніі бывае, кандыдаты на ўладныя крэслы абяцаюць. Адным з найбольш мілых абяцанням абшараў з'яўляецца культура. Так і цяперака, у час самаўрадавай выбарчай кампаніі. Населі на „мілую" тэму таксама найбольш сур'ёзныя — у ацэнках даследчыкаў, зандзіруючых палітычыня настроі — кандыдаты ў прэзідэнты Беластока: Марэк Казлоўскі (ПіС) і Тадэуш Трускаляскі (ПО). Той першы ў сваёй давыбарчай праграме весціць высокі лозунг: „Беласток — падляшскай культурнай метраполіяй". Ужо калісьці такія запэўніванні я чуў. Можа, нават з вуснаў беластоцкіх уладароў, сярод якіх заўжды, значыць, з 1990 года, быў кандыдат Казлоўскі (шматгадовы намеснік старшыні Гарадской рады і віцэ-прэзідэнт горада). Стаў я ўглыбляцца ў культурны праграмны абзац: „Будзем падтрымліваць пабудову Падляшскай оперы і філармоніі, у такім абсягу, у якім нам дазволіць на гэта [..! — М. Х.] гарадскі бюджэт. Змадэрнізуем Беластоцкі лялечны тэатр. Будзем рэвіталізаваць існуючыя на тэрыторыі горада аб'екты даўніны. А найважнейшы праект — заснаванне Музея гісторыі Беластока".

Контркандытат Казлоўскага — Тадэуш Трускаляскі заяўляе вось такое: „Адкрыем багатую гісторыю горада: гістарычныя месцы памецім метрыкамі, з якіх даведаемся аб традыцыях нашага горада; адновім лінію унікальнай у маштабе нашай краіны мяжы паміж Каронай і Літвой [..! — М. Х.], якая прабягала праз горад", „створым гарадскі Фонд культуры і традыцыі: будзе ён падставай фінансавання найважнейшых культурных ініцыятыў". Абяцанні, абяцанні, абяцанні. Ну, дык, як гэта кажуць і на Усходзе, і на Захадзе, „пачакаем, пабачым".

Тым часам, бы ў спасылцы на культурную будучыню беластоцкай метраполіі, дайшла да мяне „Уступная канцэпцыя варшаўскага Музея мадэрнага мастацтва". Як гэта адносіцца да культурнага Беластока? А вось у г.зв. сетцы стратэгічных партнёраў апынуўся Беласток, як — побач Лодзі і Любліна — „горад з вялікім патэнцыялам". Пералічаны ў канцэпцыі яшчэ толькі Гданьск, Кракаў, Познань і Вроцлаў. Чым мае быць Музей мадэрнага мастацтва? „Будзе прадстаўляць здабыткі і перамены польскага мастацтва XX і XXI стагоддзяў у міжнародным кантэксце; будзе ствараць калекцыю мастацтва, паказваць важкія навейшыя з'явы з галіны візуальнага мастацтва, фільма, тэатра і музыкі, а таксама будзе падтрымліваць выдатна таленавітыя асобы. Музей мае быць платформай дыялогу паміж традыцыяй і новымі плынямі". Маюць яго паставіць ля Палаца культуры і навукі. Агулам зойме каля 16 тыс. квадратных метраў. Цікава, ці шанц, які дае таксама і Беластоку гэтае найбольшае мастацка-культурнае мерапрыемства, каторысь з кандыдатаў у прэзідэнты горада гатовы выкарыстаць і ці ўвогуле ведае аб гэтай канцэпцыі. З праграм найбольш сур'ёзных кандыдатаў — Казлоўскага і Трускаляскага — гэта не вынікае. Я перакананы, што гэтую ідэю можа сустрэць супраціў, асабліва правых і крайне правых, ад гадоў уплываючых на беластоцкія ўлады, груповак і арганізацый. І справа не — як гэта ў Беластоку бывае — у самой ідэі, а ў асобах, якія за ёю стаяць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беларускі камітэт стартуе самастойна; не зблакіраваў ён сваіх спіскаў з іншымі камітэтамі. У Гарадскую раду Беластока вылучае ён дваццаць дзевяць кандыдатаў, ва ўсіх пяці акругах. На спісках у кожнай з пяці акруг апынулася дакладна столькі кандыдатаў, колькі ў дадзенай акрузе ёсць мандатаў...

Нашы ў Гарадскую раду Беластока

Падобна як чатыры гады таму, таксама і цяпер 12 лістапада кандыдаты ад Беларускага выбарчага камітэта будуць змагацца за дэпутацкія мандаты ў Гарадскую раду Беластока і ў Ваяводскі сеймік. У гэты раз БВК не вылучыў кандыдата на прэзідэнта Беластока. На папярэдніх самаўрадавых выбарах быў ім праф. Антон Мірановіч, які на сёлетніх выбарах балатуецца ў Гарадскую раду сталіцы Падляшша.

— Вядома, што наш кандыдат не меў бы большых шанцаў на перамогу ў гонках з шасцёркай прэтэндэнтаў на гэтае крэсла, — згодна кажуць дзеячы БВК.

Беларускі камітэт стартуе самастойна; не зблакіраваў ён сваіх спіскаў з іншымі камітэтамі. У Гарадскую раду Беластока вылучае ён

Віктар Стахвюк

дваццаць дзевяць кандыдатаў, ва ўсіх пяці акругах. На спісках у кожнай з пяці акруг апынулася дакладна столькі кандыдатаў, колькі ў дадзенай акрузе ёсць мандатаў. І так вось у **акрузе н-р 1** (м. інш. кварталы Бэма, Прывакзальны, Новае Места) спісак адкрывае Віктар Стахвюк, адзін з шэфаў Радыё Рацыя. За ім на спіску стаяць: мастак і царкоўны дзеяч Уладзіслаў Петрук, Андрэй Жамойда, журналістка „Рацыі" Валянціна Лаеўская і сацыёлаг Марк Кірылюк.

— БВК, каб магчы перагаласаваць любыя пастановы, мусіў бы, мабыць, пастарацца за галасы іншых клубаў. Важным з'яўляецца тое, каб сігналізаваць беларускія праблемы, якія вынікаюць хоць бы з закону аб нацыянальных меншасцях. Мне, як жыхару Беластока, не хапае гаспадарскага вока, падтрымкі інтэлектуальнага і гаспадарчага патэнцыялу. Гаворка асабліва пра падтрымку мясцовага бізнесу. Не можа быць так, што інвестары звонку могуць разлічваць на самыя розныя ільготы, — кажа лідэр спіска Віктар Стахвюк, пералічваючы яшчэ шэраг хібаў, якія неабходна паладзіць, м.інш. неабходнасць пабудовы свайго роду аквапарку, дзе на Беласточчыне можна было б адпачываць.

Г.зв. лакаматывам спіска БВК у **акрузе н-р 2** (Ярашоўка, Беласточак, Петрашы, Сянкевіча, Пячуркі) з'яўляецца гісторык праф. Антон Мірановіч, навуковы работнік

Антон Мірановіч

Універсітэта ў Беластоку, апошняй кнігай якога з'яўляецца „Праваслаўе ў Польшчы":

— Мы разлічваем на годнае прадстаўніцтва ўсякага роду інтарэсаў беларускага асяроддзя. А калі гаворка аб гаспадарчых пытаннях, што здаецца быць найважнейшым для нашага горада, дык трэба ўрэшце падзейнічаць для справы кальцавой дарогі вакол... Беластока!

За прафесарам А. Мірановічам апынуліся: паэтэса, празаік і журналістка „Нівы" Міраслава Лукша, гісторык Алег Латышонак, Дарыюш Самсонік, Яўген Пятэльскі і навуковец Веслаў Іванюк.

— Мы за тое, каб Беласток урэшце пакарыстаўся сваім козырам, якім без сумнення з'яўляецца, як шмат аб гэтым гаворыцца, шматкультурнасць. А ў аспекце культуры, якой м.інш. я хацела б займацца ў Гарадской радзе, трэба зрабіць усё, каб таксама наша, беларуская, тутэйшая, знайшла сваё пастаяннае і важнае месца, — заяўляе Міра Лукша.

За мандаты ў **акрузе н-р 3** (м.інш. Баяры, Пяста, Міцкевіча, Дайліды) змагацца будуць па чарзе: Марк Кулакоўскі, Ірэна Баран, Лявон Саўчук, Тамаш Алексяевіч, Аляксандр Сушчэня і Міхал Стэльмашук.

Фота ГАННЫ КАНДАЦЮК

Марк Кулакоўскі, юрыст, у свабодных хвілінах акцёр тэатральных пастановак у польска-беларускім прадшколлі н-р 14 у Беластоку

У чарговай **акрузе — н-р 4** (Лясная Даліна, Марчук, Сонечны Сток, Зялёныя Узгоркі, Старасельцы) маюць намер засесці ў беластоцкім самаўрадзе: гісторык Пётр Хомік, Юры Крысюк, Мікалай Валіцкі, інфарматык і журналіст Аляксандр Максімюк, прадпрымальнік Яраслаў Шыркавец. Аб сваіх планах у ГР кажа лідэр спіска Пётр Хомік:

— У першую чаргу трэба ўрэшце вырашыць праблемы планаў добраўпарадкавання горада. Гэта нараджае шмат праблем, а нават вядзе да людскіх трагедый. Нявырашанай застаецца праблема аэрапорта. Чаму такія гарады, як Жэшаў, маюць сваё лётнішча, а мы ўсё — не? Неабходна таксама вырашыць справу права на ўласнасць „Ягелоніі". У іншых гарадах стадыёны аграмаджаны. Урэшце — гарадская культура. Самой пабудовы оперы недастаткова. Трэба падтрымліваць меншыя мерапрыемствы, такія, як аброслая ў традыцыю „Восень з блюзам". І на канец, як БВК, мусім быць заступнікам усіх меншасных арганізацый у горадзе. Падтрымліваць іх і фінансава, і забяспечыць іх памяшканнямі, каб маглі яны развівацца, паклапаціцца пра развіццё меншаснай асветы.

Урэшце ў апошняй **акрузе — н-р 5** (м.інш. Антонюк, Дзесяціны, Фасты, Завады, Бацечкі) ад БВК кандыдуюць: юрыст Пятро Юшчук, галоўны рэдактар „Часопіса" Юры Хмялеўскі, Бажэна Балдоўская, Юры Іванюк, публіцыст „Нівы" Мацей Халадоўскі, Анна Шымчук і Міраслава Раманчук.

Пятро Юшчук:

— Найбольш неадкладным з'яўляецца юрыдычнае афармленне планаў прасторавага добраўпарадкавання Беластока, да таго прымаючы пад увагу ўсе аспекты — транспартныя, жыллёвыя, размяшчэння школ, паслуговай ці адпачынкавай базы. Ад гэтага залежыць усё апошняе. У рамках генеральнага плана добраўпарадкавання павінны вырашыцца таксама такія перспектыўныя прапановы з уключэннем у супрацоўніцтва г.зв. спадарожнікаў, значыць, сумежных пасёлкаў і асяродкаў.

Мацей Халадоўскі:

— Неяк не ўдалося дагэтуль поўнасцю выкарыстаць той амаль памежны характар Беластока. Ёсць поўны спісак гарадоў, з якімі Беласток мае падпісаныя дамовы аб супрацоўніцтве (г.зв. гарады-пабрацімы) ад Гродна аж па галандскае Эйндхавен. Адзіны практычны вынік гэтых паразуменняў — перададзеныя нам з'езджаныя аўтобусы, часта зацесныя, недастасаваныя да беластоцкіх умоў. А дзе тыя „браты" ды „сёстры" — інвестары?

Пётр Хомік

Цяпер толькі ў руках выбаршчыкаў тое, каб беларусы з БВК (хоць, мабыць, не толькі) маглі змагацца таксама за беларускія інтарэсы ў беластоцкай Гарадской радзе. Праз тыдзень — больш аб кандыдатах БВК у Падляшскі сеймік.

Пятро Юшчук

Раіна СТЭФАНЧУК
Фота Міры ЛУКШЫ

Бульбашам пра бульбу

На вёсках завяршылася ўборка бульбы — адной з асноўных раслін у харчаванні. Ведаем яе з маленства. Але ці ўсё пра яе ведаем? А вось некалькі цікавінак.

З ліку ўсіх раслін, якія вырошчваюцца ў Польшчы, віды бульбы найбольш размежаваны. Да вайны вырошчвалі 27 сартоў гэтай расліны, у 1955 г. — 42, у 1984 г. — 49, а ўжо ў 2002 г. упершыню зарэгістраваных было 100 сартоў бульбы. Сёлета ў польскім рэестры бульбы значацца 132 сарты. Найстарэйшыя з іх гэта „Ірыс" (1975 г.), „Брыза" (1976), „Пэркоз" (1984) ды „Ірга" і „Ібіс" (1987). Сёння аж 97 сартоў прыдатныя ў ежу, а 35 — крухмалістыя. У ліку гэтых першых бываюць даволі кур'ёзныя сарты, якія вырошчваюцца толькі для аднаго перапрацоўчага завода, напрыклад, для вырабу чыпсаў, бульбы-фры ці сухой бульбы. Фірмы з Чэхіі і Славакіі імпартуюць ад нас дробныя, памытыя бульбіны для загортвання ў банкі. А скандынавам у сваю чаргу патрэбныя бульбы-веліканы, найлепш пустыя ўсярэдзіне.

Ва ўсёй Еўропе, таксама як і ў нас, паслядоўна скарачаецца плошча пасадкі бульбы і змяншаецца яе спажыванне. Цяпер сяляне на свае патрэбы і корм для жывёлы прызначаюць 22,5% ураджаю, а на продаж спажыўцам — 16,4%. На пасадачны матэрыял адводзіцца 13,4% ураджаю, перапрацоўчая прамысловасць паглынае 11,7%, а натуральныя страты ў працэсе захоўвання складаюць 13% атрыманага ўраджаю. Шанцам для бульбаводства магло б стаць развіццё ў Польшчы вытворчасці біяпаліва, але гэта пакуль цьмяная будучыня.

І яшчэ гістарычная цікавінка. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя ўладальнікам маёнтка ў падляшскай Карытніцы быў Цімафей Лунеўскі. На 500 гектарах угоддзяў, апрача іншых культур, вырошчваў ён бульбу. Друкаваны цэнік карытніцкай плантацыі пералічвае 28 сартоў „фабрычнай" бульбы, 38 — „сталовай" і 34 кармавыя сарты. Атрымоўваецца, што адзін чалавек на частцы 500-гектарнай гаспадаркі вырошчваў сто сартоў бульбы!

У чым жа заключаецца той так расхвалены прагрэс?

М. Ц.

У Нараўцы

Завяршаецца рамонт драўлянага будынка былой школы ў Нараўцы і ў ім будзе галерэя імя Тамары Саланевіч. У галерэі будзе пастаянная экспазіцыя, звязаная з Белавежскай пушчай і ваколіцамі ды этнаграфічны зал. У новую галерэю 60 карцін перадалі ўдзельнікі летніх пленэраў, якія ўжо шосты год адбываюцца ў Нараўчанскай гміне. Гэтаксама і сёлета жывапісцы-прафесіяналы намалявалі шмат цікавых пейзажаў ваколіц Ляўкова, Масева, Косага Моста ды Баб'яй Гары.

(мох)

Выбралі „тройку"

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дзяўчаткі і хлопцы давалі прысягу дырэктару Васілю Ляшчынскаму сумленна вучыцца і добра сябе паводзіць

Многа бацькоў пасылае сваіх дзетак у Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім, які вылучаецца добрымі вынікамі ў вучобе і спартыўных спаборніцтвах. Добрая атмасфера сярод вучняў таксама ўплывае на станоўчую ацэнку школы. Дырэктар Васіль Ляшчынскі аддае перавагу якаснай адукацыі, супрацоўніцтву з бацькамі і мясцовым насельніцтвам, аб чым сказаў у час школьнага мерапрыемства, наладжанага 6 кастрычніка, у час якога першакласнікі былі пасвечаны ў вучні і далі прысягу сумленна вучыцца і добра сябе паводзіць.

У вялікай спартыўнай зале, збудаванай з дапамогай бяльшчан, сабраліся бацькі і родныя дзетак, якія ў белых блузках (дзяўчаткі) і белых кашулях (хлопцы) увайшлі са сваімі настаўніцамі на мерапрыемства. Усе вучні мелі на галовах спецыяльна падрыхтаваныя для першакласнікаў шапкі. Хаця ў Бельску скарачаецца колькасць вучняў падставовых і гімназічных школ, то ў „тройцы" гэты працэс амаль непрыкметны. У гэтым годзе надалей дзеці вучацца ў чатырох паралельных першых класах падставовай школы і таму на школьнай урачыстасці было шматлюдна. Наймалодшыя вучні падрыхтавалі мастацкую частку, з улікам беларускіх песень. Перад дзеткамі выступіў дырэктар Васіль Ляшчынскі, які коратка напомніў сабраным гісторыю школы і яе поспехі.

— Ужо сорак першы раз распачынаюць у нашай школе навуку першакласнікі, а больш за 3 200 выпускнікоў закончыла нашу падставовую школу (да іх трэба яшчэ дадаць выпускнікоў гімназіі — каля 700 асоб). Сярод былых вучняў нашай школы ёсць лекары, настаўнікі, юрысты і прадстаўнікі многіх іншых прафесій. Цешыць, што асобы, якія пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў вярнуліся на пастаяннае жыхарства ў Бельск, пасылаюць у нашу школу сваіх дзетак. Гэтым самым працягваецца сувязь выпускнікоў са школай, — заявіў дырэктар Васіль Ляшчынскі. Звярнуў ён таксама ўвагу на добрую працу настаўнікаў і адукацыйныя поспехі старэйшых вучняў.

— Калі будзеце вучыцца ў школе з традыцыямі, вы павінны памятаць кім былі вашы бацькі і дзяды, — сказаў вучням айцец Адам Дзенісюк, настаўнік Божага закону, які таксама заклікаў не забываць Бога і малітваў.

Дзеткі паспяхова адказвалі на пытанні па матэрыяле навучання, з якім паспелі ўжо пазнаёміцца за месяц адукацыі. Наймалодшыя вучні побач спеваў прэзентавалі таксама дзіцячыя танцы.

— У нашай школе найважнейшае дзіцё і яго свет. Патрыятычнае выхаванне ў адносінах да нашай краіны знаходзіць далікатнае адлюстраванне на нашых мерапрыемствах, але мы з гэтым не пераборшчваем, — сказаў у час пазнейшай гутаркі дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Патрыятычнае выхаванне, што тычыцца беларускіх спраў, праводзіцца на ўроках беларускай мовы і таксама на разнародных мерапрыемствах. Важныя ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларускія конкурсы і спаборніцтвы. Пад 200 дзетак прымае ўдзел у школьным адборы беларускамоўнага дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова", сярод якіх пасля ёсць пераможцы цэнтральнага фіналу. Нашы вучні перамагаюць у конкурсах беларускай песні і прадметных конкурсах беларускай мовы.

Прысягу і пасвячэнне першакласнікаў у вучняў папярэдзіла фатаграфічная сесія. Бацькі прыйшлі ў школу з фотаапаратамі, каб увекавечыць важную хвіліну ў жыцці сваіх дзетак. Пасля прысягі дзеткі праходзілі пад велізарнымі каляровымі алоўкамі, сімваламі добрай адукацыі, і пасвячаліся ў вучняў. У час гэтага абраду намеснік дырэктара школы Вера Міхноўская клала на плечкі дзетак вялікае пяро, якое, згодна адукацыйным традыцыям, замяшчала вайсковую шпагу. У арганізацыі мерапрыемства дапамагала другі намеснік дырэктара Яўгенія Васілюк, якая з верасня працуе ў „тройцы", пакінуўшы дырэктарскую пасаду ў арлянскай школе. З рук старшыні Рады горада Бельска-Падляшскага Пятра Кандрацюка вучні атрымалі пасведчанні аб прыняцці іх у лік школьнай сям'і.

Калі ў „тройцы" колькасць навучэнцаў трымаецца на ўзроўні падобным да мінулых гадоў, а дзеці і моладзь надалей вучацца да вечара і па суботах, дырэкцыя школы хоча выступіць з прапановай разбудовы будынка прызначанага на вучобу.

— Наш школьны будынак быў узведзены яшчэ ў шасцідзесятых гадах і непрыстасаваны ён да адукацыі такой колькасці дзяцей, якая зараз у нас вучыцца, — тлумачыў Васіль Ляшчынскі. — У нас жа зараз вучыцца каля 30% ад агульнай колькасці бельскіх гімназістаў, а апошнім часам прыходзяць у нашу гімназію нават вучні з Храбалоў ці Орлі. У „тройцы" зараз пад 860 вучняў і для навучання іх на адной школьнай змене трэба збудаваць яшчэ 12 кабінетаў.

Перад першакласнікамі з вершамі і віншаваннямі выступілі старшакласнікі. Апошнім часам вучні „тройкі" занялі другое месца ў Падляшскім ваяводстве ў падліку спартыўных спаборніцтваў у катэгорыі падставовых школ.

— Сярэдняя ацэнка нашых кантрольных экзаменаў за апошні школьны год вышэйшая за сярэднюю ў горадзе, павеце, ваяводстве і краіне. У ліку 121 сёлетняга выпускніка гімназіі толькі 5 асоб пайшло вучыцца ў школы, дзе адукацыя не канчаецца матуральным экзаменам. У нас добрая, свойская атмасфера і таму прыходзіць у нашу гімназію вясковая моладзь, якая спатыкаецца са зразуменнем з боку гарадскіх вучняў, — заявіў Васіль Ляшчынскі. — Каб добра выхаваць дзяцей і моладзь, трэба знаёміць іх са сваёй традыцыяй і культурай. У нашай школе вяртаемся да народных святкаванняў. Успамінаюцца ў нас рэлігійныя абрады. Прымаюць у іх удзел бацькі і гэта ўзмацняе сувязь з мінулым і нашым асяроддзем. Школьнай формы не будзем уводзіць, але я за тое, каб вучні ў школе не моднічалі, толькі апраналіся больш скромна і сваю энергію накіроўвалі на вучобу.

На заканчэнне мерапрыемства вучні атрымалі ад Бацькоўскага камітэта сувеніры (школьныя прылады), якія ўручылі намеснік старшыні Бацькоўскага камітэта Ян Барташук і дырэктар Васіль Ляшчынскі. Дзеткі з радасцю разыходзіліся дамоў, будучы пад уражаннем школьных святкаванняў.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Першакласнікі спявалі і танцавалі перад сваімі роднымі

НАС ПАВІНШАВАЛІ З ЮБІЛЕЕМ

Анатоль ПАРЭМБСКІ

„Ніве” на 50 гадоў

„Ніва”, мая „Ніва”,
„Ніва” дарагая!
Беларус няшчасны,
Як цябе не знае!

Хоць мы пражывалі
На зямельцы роднай,
Але не зазналі
Шчасця ні свабоды:

Аднялі нам школы,
Забіраюць мову —
Пень пакінуць голы,
Без вутка, асновы.

Толькі Ты нас, „Ніва”,
Беражэш як можаш,
Хоць цябе таксама
Скубаюць, трывожаць.

Тваё нараджэнне
Успамінаю міла.
Столькі ж нашых дзетак
Чытаць навучыла!

Ты была нам зоркай,
Ты была нам шляхам,
Ты была вясёлкай
Пад падляшскім дахам.

Пяцьдзесят гадочкаў
Пражылі з табою.
Будзь далей нам, „Ніва”,
Збавеннай свячою.

Другога паўвеку
Жыві больш шчасліва,
Беларус каб цвёрда
*Казаў: **наша „Ніва”**.*

PRAWOSŁAWNY METROPOLITA
WARSZAWSKI I CAŁEJ POLSKI
Al. Solidarności 52, 03-402 Warszawa

Warszawa, dnia 14. X.2006 r.

Шаноўная
Рэдакцыя Тыднёвіка *Ніва*

Беласток

У гэтым годзе Тыднёвік Ніва святкуе 50 – годдзе свайго дзейнічання прэсавага ў службе для беларускага грамадства ў Польшчы.

Сардэчна паздраўляю ўсіх Працоўнікаў і Супрацоўнікаў Тыднёвіка з гэтым прыгожым юбілеям. Заношу малітвы за Вашу далейшую дзейнасць і за Тых, якія былі перад Вамі і адышлі да Бога, пакідаючы трывалы след між намі.

Няхай Бог узнагродзіць Ваш труд, накіраваны не для асабістага зыску, а дзеля распаўсюджвання беларускасці, культывавання нацыянальных традыцый Беларусаў, апяваючы прыгожасць нашай Айчыны на ўзбярэжжах Бебжы і Нарвы, сярод дрэваў Пушчы Белавежскай.

Мінулыя 50 гадоў - гэта гістарычна эпоха. Яна распачалась ў час глыбокага камунізма, калі свабода была моцна абмяжаванна. Канец гэтай эпохі – гэта псэўдадэмакрацыя, дзе ўсё можна, хаця нават і злое маральна.

50 мінулых гадоў – гэта час велікіх перамен, у якіх лёгка было чалавеку загубіцца, страціць сперад вачэй праўду, дацца ашукаць „фальшывым прарокам” і агітатарам. Добра, што Беларусы ў гэты час мелі „святло ліхтара”, якое падсказвало ім як павінны паступаць, каб не зняславіць свайго добрага імені, каб служыць не для партыяў і ўладаў, якія мінаюць, а дзеля нашай супольнай Айчыны. Радуюсь перад усім з гэтага, што яны не пакінулі веры сваіх прэдкаў, цвёрда трываючы ў Праваслаўі.

Наступных 50 гадоў – гэта новы труд. Перад Нівай місія вядзення Беларусаў да ўнійнага грамадства, якое можа паглынуць Белрусаў або даць ім магчымасць падкрэсліць сваі вартасці і культуру. Узбагачайце наш народ каб стаў ён багаццем аб´яднанай Еўропы. Трэба шукаць дарог да сэрцаў нашай моладзі, каб абучаючы заходні мовы не забылі яны роднай мовы сваіх прэдкаў. Патрэбна навучаць іх нашага мінулага каб належна будавалі будучае.

Дарагія! Будзьце верны і ў сотую гадавіну вашага Тыднёвіка.

На далейшы труд Рэдакцыі прызываю Божае благаславенне.

+ Сава,

Праваслаўны Мітрапаліт Варшаўскі і цэлай Польшчы

PRAWOSŁAWNY BISKUP
BIAŁOSTOCKI I GDAŃSKI
ul. Św Mikołaja 3, 15-420 Białystok
tel./fax (0-85) 742-40-88

Białystok, dnia 11.10.2006 r.

Nr 172/40/2006

Паважаны Спадар
Яўген В А П А
Галоўны Рэдактар Тыднёвіка “НІВА”

Паважаны Спадар Рэдактар,

У сувязі з пяцідзесятымі угодкамі Тыднёвіка “НІВА” складаю шчырые віншаванні Вам, сучаснаму Галоўнму Радактару і усім Вашым Супрацоўнікам якім дадзе-на ганарыцца спадчынаю Вашых папярэднікаў і радавацца сваімі дасягненнямі.

Пяць дзесяткаў год у жыцці чалавека, гэта залаты юбілей. - Пяцьдзесят год існавання Тыднёвіка, у незаўсёды спрыяльных умовах, гэта амаль эпоха. Ад пачатку існавання “Ніва” была адзінаю газэтаю якую чыталі Беларусы ва усёй нашай краі-не ды далёка за яе межамі. Нават тады, калі нельга было пазытыўна пісаць на рэлігійныя тэмы і праўдзіва сведчыць аб духоўным жыцці народа – друкавалі каляндар “Нівы”, сціпла падуманы каб паказаць і царкоўные святы. Людзі з пашанаю віталі добрае – адзін каляндар, што быў дадаткам да газэты, вісеў на сцяне а другі - у форме кніжкі - ляжаў на пачэсным месцы амаль у кожнай праваслаўнай хаце! Вядома аднак, што сёння, святкуючы Угодкі, нельга задавальняцца толькі дасягненнямі мінулага - неабходна думаць: што унясем у будучыню.

З думкаю аб гэтай будучыні жадаю Вам і Вашым Супрацоўнікам Божага блаславенства на тое, каб заўсёды маглі выпаўняць старонкі “Нівы” весткамі якіе будуць яднаць Беларусаў для важных падзей ды звычайнае паўсядзённасці. Яднаць для добрага, абараняць перад злом, сведчыць аб духоўным, вучыць кахаць роднае, пераконваць аб тым, што у разрозненасці будзем лёгкаю дабычаю зла а у еднасці заслужым на пашану другіх.

Далучаю пажаданні кожнаму з Вас у аддзельнасці: здароўя, радасці, шчасця ў Вашых сем'ях і гонару у Народзе. Няхай Добры і Міласэрны Бог блаславіць усе Вашые добрые намеры і накіруе іх у карысць Народу і славу Царквы.

+Яўген

Епіскап Беластоцкі і Гданьскі

ПАСОЛЬСТВА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

КАЛЕКТЫВУ ТЫДНЁВІКА
БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
"НІВА"

Паважанае спадарства !

Прыміце словы віншаванняў з 50-гадовым юбілеем тыднёвіка беларусаў у Польшчы "Ніва".

За сваю паўвекавую гісторыю тыднёвік "Ніва" унёс значны ўклад у развіццё беларускай мовы і культуры, падтрымку самабытнасці беларусаў у Польшчы.

У гэтыя дні варта асабліва падзякаваць за самаадданую шчырую працу шматлікім аўтарам "Нівы". Сярод іх - Георгій Валкавыцкі, Віктар Швед, Віктар Бура, Міхась Хмялеўскі, Ада Чачуга, Міраслава Лукша, Ганна Кандрацюк і многія іншыя, якія з'яўляюцца прыкладам адданасці беларускай справе ў Польшчы.

Жадаю ўсім, хто прымае ўдзел у стварэнні сённяшняга тыднёвіка, новых творчых ідэй і здабыткаў, захавання аб'ектыўнасці і талерантнасці. Няхай надалей "Ніва" будзе запатрабаванай для чытачоў, скіроўвае свае намаганні на аб'яднанне беларусаў Польшчы незалежна ад іх поглядаў на карысць далейшага развіцця беларускай асветы і культуры.

Моцнага Вам здароўя, дабрабыту і аптымізму!

Павел Латушка

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол
Рэспублікі Беларусь у Польшчы

Варшава, 14 кастрычніка 2006 года

Czasopis

50-тая гадавіна штотыднёвіка „Ніва”

– гэта гістарычная падзея для беларусаў у Польшчы, і не толькі тут!..

...Сёння гэта – сымбаль беларускасці, распазнавальны ва ўсім свеце. На працягу паўвеку свайго існавання „Ніва” для беларускай справы зрабіла найбольш ва ўсёй гісторыі тутэйшых беларусаў. Несучы у наш народ пісанае роднае слова спрычынілася найперш да разбуджэння беларускай нацыянальнай сведамасці на Беласточчыне. Па сёння нясе яна не толькі інфармацыі пра нашае жыццё, але замацоўвае тут беларускую тоеснасць.

Дзякуючы перадусім „Ніве” ўзнік і надалей развіваецца беларускі інтэлектуальны рух. Не толькі літаратурны, таксама асветны, культурны і навуковы. Заслугай „Нівы” ёсць і тое, што сёння маем і іншыя беларускія рэдакцыі – у друку, радыё, тэлебачанні і інтэрнэце. Усе нашы журналісты, якія стварылі нават сваю асобную арганізацыю, прафесійнага варштату – а нават мовы – вучыліся найперш менавіта з „Нівы”. І надалей з'яўляецца яна не толькі нашым найважнейшым выдавецкім цэнтрам, які выпускае таксама важныя для нас кніжкі, але і галоўным у Польшчы беларускім інтэлектуальным і культурным асяродкам. І каб была яна ім як найдаўжэй. Няхай „Ніва” нам будзе і будзе!

Беласток, 14 кастрычніка 2006 г.

Юрка Хмялеўскі

/Старшыня Асацыяцыі беларускіх журналістаў,
Галоўны рэдактар штомесячніка „Часопіс”/

Выдавец: Асацыяцыя беларускіх журналістаў, Беласток, вул. Ліповая 4/221. **Карспандэнцыйны адрас**: „Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: czasopis@free.ngo.pl. **Інтэрнэт-старонка**: www.czasopis.com. Тэл. (085) 653 79 66

Незабыўныя ўспаміны

З „Нівай” эмацыянальна звязаныя мае дзяцінства і маладосць. Была я шматгадовым карэспандэнтам, у „Парнасіку” друкаваліся мае вершы. Адгэтуль пачаўся мой шлях у Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа”. Найбольш трывалымі ўспамінамі звязанымі з супрацоўніцтвам з „Нівай” засталіся мне з'езды карэспандэнтаў. Малодшыя, старэйшыя, розных прафесій, адкуль мы і не з'язджаліся, так як з розных месцаў наплывалі пахвальныя і крытычныя інфармацыі ў рэдакцыю.

Мінулі гады. Прайшла не адна вясна, а новазасеянае зерне надзеі ўзыходзіла і давала свой плён. Лістаючы старонкі альбома «Ніва» час і людзі 1956-2006” нельга не заўважыць колькі крутых і далёкіх сцяжынак Беласточчыны прайшоў тыднёвік, у колькіх дамах быў госцем. На многіх здымках дзеткі з розных школ. Дзе яны цяпер? Адплыло бестурботнае дзяцінства, кожны дзень асыпаўся чарговым лістком календароў. І так „Ніве” споўнілася 50. Гэта залаты юбілей і адначасова вялікая спадчына, якая творыць гісторыю беларускай культуры не толькі ў Польшчы. Вялікае дзякуй усім за ўкладзеныя цаглінкі ў росквіт роднай мовы на старонках „Нівы”.

На „Беларускіх Днях «Нівы», прысвечаных 50-годдзю выдання, якія адбыліся 14 кастрычніка г.г. у Беластоку і якіх я была ўдзельнікам і госцем, заўважалася ветлівую ўсмешку на тварах людзей, плылі пажаданні і былі ўсхваляванні. Адчувалася цёплы і сардэчны настрой.

Няхай жа так будзе многія леты.

Жэня МАРТЫНЮК

Успамін пра К. Майсейню

З Польшчы ў Беларусь прыйшла сумная вестка: абарваўся зямны шлях Кастуся Майсені, аднаго з заснавальнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы.

Гэтая асоба мае шырокую папулярнасць сярод беларусаў свету сваёй надзвычайнай адданасцю ў падтрымцы беларускасці ў суайчыннікаў. Сын беларускага народа — Канстанцін Мікалаевіч Майсеня нарадзіўся 15 жніўня 1923 года ў вёсцы Ліпа пад Баранавічамі. Беларус па нацыянальнасці, грамадзянін Рэспублікі Польшча, ён пакінуў след у гісторыі двух народаў, унёс вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне беларуска-польскіх стасункаў. Яго прафесійная дзейнасць была звязана з будаўніцтвам. У 1984 годзе Канстанцін Майсеня ініцыяваў стварэнне ў Гайнаўцы Музея і цэнтра беларускай культуры і ўнёс значны асабісты ўклад у рэалізацыю гэтай ідэі. Сёння музей і цэнтр беларускай культуры на Беласточчыне — адзіная падобная беларуская ўстанова за мяжой. У Беларусі і ў свеце ў Канстанціна Майсені засталося шмат сяброў і паслядоўнікаў.

Рэдакцыя газеты „Голас Радзімы” і Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом „Радзіма” смуткуюць з выпадку смерці Кастуся Майсені і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным, блізкім і ўсім паплечнікам.

Галоўны рэдактар
Н. У. САЛУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 46 —

Гражынчын клас выбіраўся ў кіно. Адзіны ў гэты раз з усяе школы. На доўгі, амаль у тры гадзіны фільм. Заняткаў у той дзень мела не быць. Ды на тое, каб пайсці на гэты фільм, патрэбны пісьмовы дазвол таты ці мамы. Бо ж трэба таксама заплаціць за сеанс.

— Мабыць, нейкі патрыятычны той фільм, — паківала галавой бабуля. — Гэта, мабыць, пад міністра Рамана і ягоныя прапановы, каб моладзь выхоўваць у такім духу. Трэба, трэба, а то адно нейкія Лары Крофт, нейкія коміксы глядзіце. Ну, без абразы, Гражынка!

— І там ёсць героі, якія могуць падабацца! — заўважыў Грак, які вельмі любіў паглядзець нейкі фільм пра адважнага і моцнага героя, які зможа перамагчы ўсё благое, што пагражае свету ды ўсяму сусвету. І нават тыя героі, бы тыя птахі, лятаць умеюць, і страляць ды ўрукапашную б'юцца як ніхто ў свеце. Ды якія прыгожыя тыя дзеўкі — нават граку падабаюцца, асабліва калі ў іх валасы чорныя як грачынае крыло...

— А мне падабаецца тая... Лара. Люблю чарнявых, — размарыўся Грак. — Такія моцныя гераіні!

— Нашай гераіняй можа быць, скажам, адно Эмілія Плятэр ці літоўская Гражына! — бабуля глянула на рудыя хвосцікі ўнучкі. — А ў гэтым фільме вялікага чалавека будуць паказваць. Калі настаўнік палічыў, што варта весці вучняў на паказ такога фільма, дык няма чаго адмаўляцца.

— А той фільм добра пастаўлены? — пацікавілася мама, вырываючы са сшытка да заметак лісток, каб напісаць заяву ў Гражынчыну школу.

— Не ведаю, — уздыхнула Гражынка. — Мабыць, добры. Мастацкі. Нядаўна нам паказвалі фільм, дзе не было ніякіх падзей, аб чым нам заранёў паведаміла настаўніца. Сапраўды, раз адно там стрэлілі.

Мама напісала пару слоў на лістку, пад усім падпісалася. Адлічыла Гражынцы грошы на фільм.

Назаўтра ўвечары, пасля сеанса, Гражынка за вячэрай расказала змест змястоўнага фільма пра вялікага героя.

— А ты, мама, ці мусіла напісаць, што пагаджаешся на тое, каб я паглядзела гэты фільм, з такой агаворкай: „У выпадку, калі ён не з'яўляецца халтурай"?! Увесь клас смяяўся! А настаўніца? Толькі ўздыхнула: „Яшчэ пабачым... што нам яны пакажуць!"

Міра ЛУКША

У IV „а" засыпалі пытаннямі!

Клас IV „а" з настаўнікамі: Валянцінай Бабулевіч і Андреем Марозам

— Дзеці ледзь дачакаліся, так выглядалі „Зорку"! — кажа на добры дзень настаўніца Валянціна Бабулевіч.

Сёння сустрэча ў бельскай „тройцы". Мы ў інтэграцыйным IV „а" класе. У школе тры такія класы. У іх абмежаваная колькасць вучняў і двух настаўнікаў на ўроку. Калі адзін вядзе ўрок, другі займаецца індывідуальна з вучнем.

Сёння ўрок вядзе спадарыня Валянціна. Андрэй Мароз, сімпатычны настаўнік, падыходзіць да кожнай парты і паясняе што трэба кожнаму з асобна.

— Давайце прывітаем „Зорку"! — прапануюць настаўнікі.

Дзеці выходзяць на сярэдзіну класа з каляровымі кардонкамі. На іх размаляваныя буракі, пятрушка, трускалка — словам — уся агародніна. Пакажуць мне вясёлы спектакль пра сварлівую агародніну. Многія акцёры хвалююцца, даюць з сябе ўсё!

— А зараз мы заспяваем, — прапануюць дзяўчаткі і як тыя жаўранкі заводзяць мілагучную песеньку.

— Вы ў „Журавінцы" спяваеце? — пытаю.

— Дык не, мы ходзім на мастацкія заняткі ў Дом культуры. Вось заўтра таксама выступім на свяце „Паэтычнае трохгалоссе".

Пасля гутарым пра „Зорку". Дзеці пытаюць пра сяброў-аднагодкаў. Найбольшае зацікаўленне выклікаюць дзеці з далёкай Латвіі.

— А ці мы можам праз „Зорку" перадаць ім прывітанне? — пытае адзін хлопчык.

— Вядома, можаце.

— Тады напішыце, што мы, IV „а" клас, перадаем ім сяброўскае прывітанне.

Сказана — зроблена! (І, чакаем водгуку).

Пасля мы размаўлялі пра залаты юбілей „Нівы". Пяцьдзесят гадоў для гэтых дзесяцігодкаў явілася як цэлая эпоха. Не дзіва, наш тыднёвік ведаюць іх бацькі, дзяды і нават прадзеды.

— А пра што быў ваш першы артыкул у „Зорку"? — спытаў нехта.

— Вось, пра вашых старэйшых сяброў з „тройкі".

Пасля мы з дапамогай настаўніцы распавялі пра аўтараў, якія пачыналі пісаць у „Зорку", а зараз працуюць журналістамі або карэспандэнтамі. Пра тое, як у іх школе існаваў фан-клуб „Зоркі". Нашы паклоннікі збіралі артыкулы і фатаграфіі, якія пасля размяшчалі на інтэлігентна-гумарыстычнай насценнай газеце, на калідоры.

— А нядаўна ў школе з'явіўся практыкант-студэнт Андрэй Таранта, — адзначае настаўніца, — і ён усё ўспамінаў Сустрэчы „Зоркі".

— Тады што трэба рабіць, каб пісаць у „Зорку"? — пыталі сябры.

— Найперш, — і гэта падказка для ўсіх зацікаўленых, — трэба многа чытаць па-беларуску!

Тэкст і фота ЗОРКА

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— (3) —

Учора вечарам я прыгадала, што заўтра (гэта значыць сёння) будуць аж тры кантрольныя: па матэматыцы, па англійскай мове і па біялогіі. Я не падрыхтавалася, праўду кажучы, мне не хацелася вучыцца. Таму я патэлефанавала Ганцы, каб запытаць ці яна сядзіць у кніжках і зубрыць.

— Чэсць!

— О! Чэсць, Бася! Што здарылася? Ты мяне сарвала з ложка...

— Прабач, хачу толькі спытацца, ці памятаеш, што заўтра ў нас тры кантрольныя?

— Што? — крыкнула Ганка.

— Я таксама не магу вучыцца. Сяджу і камбіную, як тут не атрымаць адзінкі.

— А ці нехта ў нас адзначаў нядаўна дзень нараджэння? — спытала Ганка.

— Здаецца, так! Учора Матвейку стукнула 14.

— Ну так! — падбадзёрылася Ганка. — Тады раніцай купім малы падаруначак. Матвейка ж любімчык усіх настаўнікаў.

— Файна! — я паклала трубку тэлефона і пайшла спаць. Праект Ганкі спадабаўся і супакоіў мяне, я адчувала, што ўсё будзе добра.

І так, сёння раніцай, Ганка прыйшла ў школу з тортам і падарункам: кніжкай пра ружовага парсючка. Мы дамовіліся, вядома, і з Матвейкам (два дні таму мы шумна адсвяткавалі ў яго хаце ягоныя народзіны і з'елі торт).

На першым уроку матэматыкі я, Ганка, Кася і Соня ўвайшлі ў клас са спевам „Многае лета"!

Настаўніца спявала з намі, а найважнейшае, што адтэрмінавала кантрольную. Праўда, у журнале як вол было запісана, што наш сябра нарадзіўся два дні раней. Настаўніца гэта бачыла, але нічога не сказала.

Таксама было і на англійскай мове. Мы з Ганкай паціху цешыліся, што наш план набірае цела. А клас, вядома, дзякаваў за ратунак. У гэтым месцы дадам, што па кожным уроку Матвейка аддаваў нам торт і кніжку, каб мы мелі іх для далейшага хепенінга. Аднак, перад урокам біялогіі, які вядзе наша выхавацелька Аўрэлія, нам не хапіла запалак і мы з Касяй пабеглі да Антося. Калі мы выбеглі з крамы, пабачылі на сходах Гену Ляскоўскага, бадзёрага настаўніка фізкультуры і злосную спадарыню Воўк. Яны сачылі за тым каб ніхто з вучняў не выбягаў у магазін „TOSIEK-SHOP". Мы зноў прасядзелі ўвесь перапынак у Антося за лядоўняй. Калі мы прыбеглі на ўрок, Аўрэлія ўжо раздала кантрольныя, але калі мы грымнулі „Многае лета" і запалілі свечкі на торце, яна махнула рукой і адтэрмінавала кантрольную. Торт мы з'елі на гэтым уроку, ён ужо не быў нам патрэбны. А Матвейка ўзяў сабе кніжку, „за супрацоўніцтва".

Мы цешыліся як малыя кацяняты, хаця сумняваліся, ці такі план зможам яшчэ паўтарыць. Як вядома, настаўнікі не любяць паўтораў, але ўмеюць належным чынам ацаніць вынаходлівасць вучняў, нават калі ў іх вачах свецяцца хітрыкі!

тэкст:<Natasza9922@wp.pl>
дызайн:<lolcia@tlen.pl>



Галерэя „Зоркі" (Бельск-Падляшскі)

Марлена Леанюк

Фота ГАННЫ КАНДАЦЮК

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 6,0.

Твая мянушка: Мая мянушка „Леон" і „Мартадэля" (ад майго прозвішча і імя).

У жыцці хачу стаць, чаму: У жыцці я хачу стаць артысткай, бо я вельмі люблю выступаць на сцэне. Я хаджу на тэатральны гурток, які вядзе спадарыня Анна Вярцінская.

У сяброў цаню: У сяброў я цаню зычлівасць і працавітасць. Мая сяброўка Кася, калі я хварэю, заўсёды прыносіць мне ўрокі. Сапраўдны сябар павінен быць сумленны і клапатлівы. Я найбольш цаню ў сяброў шчырасць. Сябры заўсёды павінны гаварыць праўду, нават калі яна горкая.

Не люблю: Я не люблю хварэць і прыбіраць у хаце. З ежы я не люблю есці саланіну і грудзінку. Калі вяртаюся са школы дадому, то не люблю рашаць задачы па матэматыцы, а толькі гляджу тэлебачанне або чытаю кніжку.

Па-беларуску размаўляю з: настаўнікам беларускай мовы, з дзядулем і бабуляй. Я вельмі люблю беларускую мову і хачу яе паглыбляць.

Мой любімы гурт: „Прымакі", „Black and Peas".

Каля свайго дому пасаджу: „Раслінку шчасця", каб кожны чалавек быў шчаслівы і вясёлы. Я маю вялікую фантазію і вельмі хацела б, каб былі такія расліны. Тады не было б няшчасцяў, смутку і слёз.

Вершы Віктара Шведа

Дзве сяброўкі

Дзве школьныя сяброўкі
З суседніх гарадкоў
Сустрэліся ізноўку
Пасля пяці гадоў.

— Ты, мілая, завяла,
Як кажуць, на вачах.
— А я цябе пазнала
Па джынсавых штанах.

Добры сябар

— Ты заўжды прысягаць гатоў,
Што сябар мой харошы.
Колькі ж прасіць цябе разоў
Каб ты аддаў мне грошы?

— Неаб'ектыўны ты, на здзіў,
І надта ж ваяўнічы.
А колькі ж я цябе прасіў
Каб грошы мне пазычыў?

Польска-беларуская крыжаванка № 44



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 40: Пуп, нава, пачатак, салата, ара, салярый, моц, валошка, ты, працяг, шыя. Пах, сава, палац, ляля, парог, латыш, чайка, на, атам, вароты, акацыя.

Узнагароды, фотаальбомы, выйгралі: **Ася Марчук** і **Марыюш Артэмюк** з бельскай „тройкі". Віншуем!

Памёр шчыры беларус і вядомы будаўнік

„Ніва" н-р 9 (522) ад 27.02.1966 года стар. 4

Многа гайнавян і прыезджых прыбыло 14 кастрычніка на пахаванне Канстанціна Майсені, чалавека адданага беларускай ідэі, будаўніка Беларускага музея і звыш ста вясковых крамаў. Каля яго труны стаялі сямейнікі, дыпламаты Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі мясцовых улад і беларускіх арганізацый, настаўнікі, людзі культуры. Пасля літургіі ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы і пахавальных малітваў сабраныя перайшлі за труной на праваслаўныя прыхадскія могілкі, дзе быў пахаваны Канстанцін Майсеня. У час жалобнай урачыстасці выказана было многа цёплых слоў у адрас дзеяча, які самааддана працаваў у карысць мясцовага насельніцтва.

— Кастусь Майсеня быў шчырым беларусам, які заслужыў сімпатыю многіх людзей, — заявіў паэт Віктар Швед.

— Не будучы сынам гэтай зямлі, Ты ўнёс вельмі многа ў развіццё нашай малой айчыны, — сказаў паэт Алесь Барскі. — Ты ўрос глыбока ў нашую зямлю і я шчаслівы, што якраз ляжаш на спачыванне ў Гайнаўцы.

Канстанцін Майсеня нарадзіўся 15 жніўня 1923 года ў вёсцы Вялікая Ліпа Нясвіжскага раёна (Беларусь) і там правёў дзяцінства.

— Мой муж сярэднюю адукацыю здабываў у Нясвіжы і Баранавічах, а пасля вайны ў рамках рэпатрыяцыі разам з сям'ёй пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Бельск-Падляшскі. Тут скончыў ён сярэднюю школу для працуючых і падаўся ў Познань, дзе паспяхова закончыў вучобу ў Вышэйшай эканамічнай школе, — расказвае Анастасія Майсеня. — Пасля вучобы Косцік стаў працаваць дырэктарам Эканамічнага тэхнікума ў Бельску і за яго дырэктарства ўзнік школьны будынак. Уладам не падабалася, што ён увёў у гэтай школе навучанне беларускай мовы і хутка перавялі яго на іншую дырэктарскую пасаду.

Канстанцін Майсеня стаў дырэктарам будаўнічага прадпрыемства і з гэтага часу пачаў працаваць на званне будаўніка.

— Яго прадпрыемства будавала між іншым будынак сённяшняга Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча, — кажа Анастасія Майсеня. — Пасля майго мужа перавялі на работу ў Гайнаўку.

Канстанцін Майсеня ў Гайнаўцы стаў працаваць на пасадзе старшыні Павятовага саюза гмінных кааператываў „Сялянская самадапамога".

— Працуючы ў Гайнаўцы муж бачыў дрэнныя ўмовы гандлю на вёсках і стаў думаць аб будове сельскіх крамаў. Цяжкасці былі з прыцягненнем грошай і таму Косцік рашыў будаваць магазіны на грамадскіх пачатках. У свабодны ад працы час разам са сваімі работнікамі ездзіў ён па вёсках і на грамадскіх пачатках працаваў пры будове фундаментаў пад магазіны. Пазней на будовы ўваходзілі ўжо прафесійныя будаўнікі, — успамінае Анастасія Майсеня. — Мой муж за работай не дасыпаў і не даядаў. Грошы на будовы ўдавалася яму раздабыць у вышэйшых улад і такім чынам узнікла больш за сто вясковых крамаў. У гэтым самым часе былі збудаваны кааператыўныя будынкі па вуліцы Горнай.

Вясковыя магазіны на Гайнаўшчыне сталі называць „майсеняўкамі", а іх будаўніка сяляне ўспамінаюць па сённяшні дзень.

— Там, дзе працаваў Канстанцін Майсеня, заўсёды былі інвестыцыі. Ён заўсёды нешта будаваў, — гаворыць дырэктар Керамічнага прадпрыемства ў Ляўкове Аляксандр Бандарук.

З Канстанцінам Майсенем развіталіся каля магілы яго сямейнікі, сябры і людзі, якія ведалі яго і шанавалі

— Спадар Майсеня быў добрым арганізатарам работ. Быў канкрэтным чалавекам, не любіў крывадушнасці і ўмеў здабыць давер іншых людзей. Клапаціўся пра беларускія справы і не баяўся гаварыць па-беларуску, — успамінае Ян Хіліманюк.

Канстанцін Майсеня быў узнагароджаны Кавалерскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы і адзнакай „Заслужаны дзеяч кааператываў".

— Я бачыў Кастуся з кельняй, пілой або лапатай. Працуючы разам з іншымі, будаваў ён магазіны. Як дырэктар Ляўкоўскага камбіната выпусціў ён у свет многа мільёнаў цэглаў, з якіх узведзены былі дзесяткі і сотні будынкаў, — кажа прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

— Мой муж быў вельмі энергічны і яму замала было будаўнічых работ. Стаў на грамадскіх пачатках праводзіць камасацыю палёў у Капітаншчыне і Ахрымах, аблягчаючы такім чынам працу сялянам, — гаворыць удава.

У шасцідзесятых гадах спадара Канстанціна Майсеню звольнілі з працы і ён доўга не мог знайсці работы.

— Хмурным было жыццё майго мужа і пахмурнае надвор'е сустрэла яго ў час пахавання, — заявіць у час пазнейшай размовы са мной Анастасія Майсеня. — Уладам не падабалася, што ён замест калгасаў арганізаваў камасацыю палёў, якая замацоўвала прыватную ўласнасць на вёсцы. Аднак хіба найбольш уладам не падабалася тое, што муж не скрываў сваёй беларускасці і часта гаварыў па-беларуску, за што ў 1968 годзе звольнілі яго з працы. Хацелі перавесці мужа на работу ў Каменную-Гуру, а ў нашую кватэру прыходзіў „тайняк", які загадаў хутка выязджаць з Гайнаўкі, але мы яго не паслухалі. Пяць гадоў муж не мог знайсці працы, усе апасаліся прымаць яго на работу. Каб атрымаць працу, мой муж многа разоў ездзіў у Беласток. Пасля памаглі нам палякі і мой муж стаў працаваць дырэктарам будаўнічага прадпрыемства ў Кольне, адкуль штотыдзень вяртаўся дадому. Пазней стаў працаваць інструктарам па справах харчавання ў Беластоку, але адтуль таксама хутка яго звольнілі.

Канстанцін Майсеня, які кіраваў будовамі, сам пражыў з жонкай у аднапакаёвай кватэры велічынёю каля дваццаці пяці квадратных метраў.

— Хацелі мы памяняць нашу малую камуналку на большую, але на гэта не было згоды. У Жыллёвым кааператыве таксама не прызначылі нам большай кватэры, — успамінае спадарыня Анастасія.

Людзі, якія ведалі Канстанціна Майсеню, памятаюць яго як кіраўніка прадпрыемства здабычы торфу „Імшар" каля Міхалова і дырэктара Керамічнага прадпрыемства ў Ляўкове. Пазней Канстанцін Майсеня кіраваў сельскагаспадарчымі вытворчымі кааператывамі ў Нараўцы і Бельшчыне каля Дубіноў, адкуль перайшоў на пенсію.

— Муж працаваў таксама сакратаром і намеснікам старшыні Галоўнага Праўлення БГКТ у Беластоку. Збіраў ён экспанаты для Белавежскага беларускага музея і моцна перажываў, калі ён быў ліквідаваны, — кажа Анастасія Майсеня.

Малодшаму пакаленню на Гайнаўшчыне Канстанцін Майсеня вядомы як шматгадовы старшыня Камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы і яго галоўны будаўнік. Перастаў ён працаваць для музея ў 1998 годзе, пасля цяжкай хваробы. З гэтага моманту пастаянна лячыўся і многа часу праводзіў у бальніцы.

— Мой муж увесь час думаў як раздабыць грошы на будову музея. Паўтараў, што Беларускі музей у Гайнаўцы з'яўляецца музеем беларусаў усяго свету, — успамінае Анастасія Майсеня. — Для будовы музея муж аддаў сваё здароўе. У маразы ездзіў на Беларусь за будаўнічымі матэрыяламі і многа працаваў грамадска. Ноччу хадзіў спраўджаць, ці хто не ўкраў будаўнічых матэрыялаў, многа сваіх грошай аддаў на будову музея і прасіў грошай з маёй зарплаты.

— Канстанцін Майсеня вельмі заслужаны для беларускай культуры. Беларускі музей, які будаваў, застанецца памяткай для наступных пакаленняў, — гаворыць мастак Віктар Кабац. — Быў ён чалавекам скромным і ўпартым, у станоўчым значэнні гэтага слова і таму патрапіў рэалізаваць намечаныя сабою мэты.

Канстанціна Майсеню цёпла ўспамінаюць таксама былыя і сённяшнія музейныя дзеячы і работнікі.

— Для мяне Канстанцін Майсеня быў настаўнікам і калегам. Быў ён чалавекам высокіх маштабаў. Больш думаў аб чужых, чым аб сабе, — кажа Віктар Бура.

— Быў ён добрым беларусам, намагаўся захаваць сваю мову і клапаціўся за грамадскія справы, — заяўляе былы музейны бухгалтар Ілья Агіевіч.

— Рэдка сустрэнеш такога чалавека, як Майсеня. Ён апекаваўся намі і памагаў нашым сем'ям. Быў ласкавы ў адносінах да сваіх працаўнікоў, між намі не было спрэчак, — кажуць Іаланта і Ян, шматгадовыя музейныя работнікі.

Збіраць грошы на музей Канстанцін Майсеня ездзіў са скарбонкай на Святую Гару Грабарку і на іншыя прыхадскія фэсты. Прасіў ён людзей падтрымаць ідэю будовы музея і ўспамагчы яе фінансава. На беларускіх мерапрыемствах разам са сваімі работнікамі ладзіў латарэі і прадаваў беларускія кніжкі.

— Мне хацелася б, каб Беларускі музей у Гайнаўцы быў названы імем майго мужа Канстанціна Майсені і каб у адной з музейных залаў была пастаянная экспазіцыя прысвечаная яму. Разам з Віктарам Бурам хочам выдаць таксама прысвечаную мужу кніжку, — гаворыць Анастасія Майсеня.

Паявіліся ўжо станоўчыя водгукі на прапанову Анастасіі Майсені, але апошняе слова ў гэтай справе застаецца за музейнымі ўладамі.

Аляксей МАРОЗ

Пасольства і консульскія ўстановы Беларусі ў Польшчы

глыбока смуткуюць з прычыны смерці вядомага дзеяча беларускай меншасці ў Польшчы, арганізатара і стваральніка Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы

Канстанціна Майсені

і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім Нябожчыка.

Як абразы бачу перад вачыма

З **Івонкай СУРВІЛАЙ**, старшынёй Рады БНР, гутарыць **Ганна КАНДРАЦЮК**

— Ці пасля 1944 года Вы наведалі Беларусь?

— Толькі раз, у 1992 годзе. Я ездзіла на канферэнцыю „Свет пасля Чарнобыля". Гэты час я скарыстала надзвычай плённа, вельмі шмат чаго пабачыла. Год пазней, на З'езд беларусаў свету, ездзіў мой муж.

Пасля прыйшоў Лукашэнка і гэтыя магчымасці зніклі.

Я моцна-моцна тужу і сумую па Беларусі. Вельмі цешуся, што прыехала сюды, на Беласточчыну.

— Вы пакінулі Беларусь 8-гадовай дзяўчынкай, жылі ў Данії, Францыі, Іспаніі, Канадзе. Як Вам удалося захаваць памяць пра Беларусь?

— У нашай сям'і заўсёды жыла Беларусь. Заўсёды гаварылася па-беларуску, абмяркоўваліся ўсе беларускія праблемы. Гэта была такая частка нашага жыцця. Тата перад смерцю прадыктаваў успаміны. Праз дваццаць чатыры гадзіны ён хацеў расказаць нам усё пра Беларусь, пра ўсе дэталі. Тата памёр у 1977 годзе. Ён думаў, што мы ніколі ўжо не пабачым вольнай Беларусі. Безумоўна, дапамагалі ў жыцці яго расказы. З другога боку, памяць часам сама стварае ўспаміны. Я маю ўражанне, што добра памятаю Засулле.

— Вы нарадзіліся ў 1936 годзе ў Стоўбцах?

— Стоўбцы я не вельмі добра памятаю, бо я там нарадзілася і жыла, здаецца, год часу. Пасля было Засулле, далей мы жылі ў Берасці, пасля ў Баранавічах, зноў у Засуллі, і зноў у Баранавічах. Тата працаваў на чыгунцы і яго пераносілі з месца на месца.

— Якія вобразы ў памяці Вы, будучая мастачка, вывезлі з Бацькаўшчыны ў свет?

— Вельмі добра памятаю Засулле, там я была ў маёй бабулі як мне было тры-чатыры гады. Памятаю ўсход сонца над нашым садам. Бачу праз акно яблыні ў кветках, памятаю як спяваў певень — такія прыгожыя абразы. Памятаю як з татам плавалі ў рэчаццы, што плыве ля Засулля. Мы з братам сядзелі ў яго на плячах, а ён плаваў і ўсе адчувалі вялікае шчасце. Памятаю сябе маленькай, як сяджу ля хаты і гляджу на луг, дзе рэчачка, направа стаіць млын, там азерца, і ўзыходзіць сонца. Гэтыя ўспаміны, як абразы, бачу перад вачыма да гэтага часу.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Івонка Сурвіла і Аляксандр Мілінкевіч

Івонка Сурвіла (Шыманец) нарадзілася ў 1936 годзе ў Стоўбцах. Закончыла вышэйшую Мастацкую школу ў Парыжы, пазней Лінгвістычнае аддзяленне Сарбонскага універсітэта (1959). У 1958-1965 гадах працавала ў беларускай рэдакцыі Іспанскага нацыянальнага радыё. З 1969 года аж па выхад на пенсію працавала англа-французскім перакладчыкам у Федэральным урадзе Канады. У 1989 годзе арганізавала Канадскі фонд дапамогі ахвярам Чарнобыля ў Беларусі, якім кіравала да моманту абрання Старшынёй Рады БНР (1997). Займаецца жывапісам, удзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Акрамя роднай валодае яшчэ васьмю мовамі: французскай, іспанскай, англійскай, нямецкай, дацкай, лацінскай, нарвежскай і польскай. Жыве ў Канадзе, мае дзве дачкі.

Апошнія два гады ў Баранавічах, дзе я хадзіла ў школу, былі страшныя, мы жылі вельмі-вельмі цяжка. Быў момант, калі нас спалілі, мы выехалі да цёткі ў вёску Дубава, і там папалі пад бомбы. Згарэла тая хата, усе нашы рэчы згарэлі, мы вярнуліся амаль голыя ў Баранавічы. Такія страшныя ўспаміны ў мяне да часу аж мы дабраліся ў Данію.

Памятаеце развітанне з Беларуссю?

— Тата быў арыштаваны між 1939 і 1941 гадамі і засуджаны на Сібір. Калі ў 1944 зноў надыходзілі бальшавікі, мы ведалі, што ён будзе вывезены. У апошні дзень, тры дні да прыходу бальшавікоў у Баранавічы, тата пайшоў пабачыць, што робіцца ў горадзе. Ён быў гатовы ісці назад у Сібір, баяўся выбірацца з трыма дзецьмі ў свет. На вакзале пабачыў усіх нашых знаёмых, яны ўжо занялі месцы ў таварных вагонах. Усе там таўкліся, пхаліся, кожны хацеў, каб як-небудзь выехаць. Тату намовілі ягоныя сябры: *мы пасунемся яшчэ крышку, каб і вы тутака змесціліся.*

Ён прыйшоў дахаты і мама кажа: едзем! Бацькі ўзялі нас трое, без нічога, і мы пайшлі ў гэты вагон. Сапраўды, людзі пасунуліся і мы залезлі ўсярэдзіну. Я сядзела ў рассунутых дзвярах і памятаю, што так махала нагамі. Ноччу мы даехалі ў Беласток, дзе прывітала нас бамбёжка і трэба было ўпацёмку ўцякаць з цягніка, а пасля бегчы назад і гдядзець, каб не згубіцца. Яшчэ цяпер, калі гэтае ўспамінаю, нападае страх, бо маглі б мы не дабегчы да цягніка, або згубіць маму. Усё, дзякаваць Богу, было добра. У Беластоку мы пераначавалі ў нейкай школе і на наступны дзень з'ехалі ў Кёнігсберг (цяперашні Калінінград — Г.К). Тата, знайшоў працу на нейкай фарме і там мы пражылі некалькі месяцаў, аж да часу, калі прыйшоў фронт ва Усходнюю Прусію. Тады мы выбраліся пяшком у бок Піляў, далей, уздоўж мора, пляжам, пад бомбамі, мы ішлі ў Гданьск. Кожны момант патэнцыяльна быў апошнім момантам жыцця. Нам было складана таксама з-за таго, што мы не былі немцамі, так што нам было цяжка папасціся на воз або ў цягнік, бо тое што функцыянавала, усё было для немцаў. У Гданьску нам сказалі, што мы не можам дастаць пропуск на карабель, каб перамяшчацца далей. І тады, так сёння думаю, стаўся такі свайго роду цуд! Тата і ўся наша сям'я былі ўжо ў канцы сіл. Мы прыселі проста ў балоце, дзе стаялі, і заснулі. І тата ўжо быў гатовы на канец.

Ноччу разбудзіў нас якісьці жаўнер і спытаў колькі нас разам. Нас было трое дзяцей і бацькі, разам пяць чалавек. Жаўнер пайшоў, а мы зноў заснулі — да такой ступені ўсе былі стомленыя пасля гэтых соцень кіламетраў, якія зрабілі пешшу. Чалавек вярнуўся, разбудзіў нас і сказаў: ходзьце! Ён узяў тату за руку, накінуў яму нешта на галаву, каб іншыя не бачылі, што гэта мужчына і завёз нас уперад доўгай, можа кіламетровай, чаргі. Ён пасадзіў нас на карабель без ніякіх пропускаў, без нічога.

(працяг будзе)

„Жыве „Ніва"! Жыве Беларусь!"

На нашае святкаванне госці прыбылі адмыслова — нават з далёкай Канады, якраз не на нейкія важныя палітычныя перамовы, на што ўжо збегліся навакольныя журналісты, як на пяцідзесяцігоддзе „Нівы". Так, былі ў нас на канферэнцыі і на ўрачыстай вечарыне і Аляксандр Мілінкевіч — лідэр дэмакратычных сіл Беларусі, і старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвіла, былі і іншыя палітыкі, служачыя ды саноўныя чыноўнікі, былі і даследчыкі беларускай справы і дзейнасці ды значэння „Нівы" ў ёй, былі і важкія словы, таксама і на будучыню, ды былі і перш за ўсё віншаванні і нагода шчыра, па-беларуску, уцешыцца і пацешыцца. Разам, з беларусамі з усіх бакоў свету, і на вачах усіх тых, каго суддзя Казлоўскі лагодна назваў „непрыхільнымі" ў прысудзе, які зняў з ніўцаў кляймо абвінавачаных. Святкавалі мы як пераможцы, якія справіліся з выклікамі часу і ўвекавечылі яго назаўсёды на старонках хронікі роднай беларушчыны. І гучалі словы ўшанавання нам як аб'екта, які пабольшваў і пабольшвае наша шматкультурнае багацце (віцэ-маршалак Сената Кшыштаф Путра), так і прызнання : „Я „Ніву" любіў, люблю і любіць буду" (Алесь Бяляцкі з „Вясны")

і ад усяго Бельска-Падляшскага — разам з настаўнікамі з вучнямі, дырэкцыяй школ ды ўладамі ў асобе віцэ-старосты Пятра Божкі, які адзначыў, што „Ніву" сталі чытаць ягоныя бацькі з канца пяцідзесятых гадоў, ён — з васьмідзесятых, а і сын ягоны цяпер таксама чытае. Іншы верны чытач — ад першага нумара! — сакольскі благачынны а. Уладзімір Місяюк, перадаўшы цёплыя словы ад епіскапа Іакава, прыпомніў, што „Ніва" была найбольш незалежным выданнем свайго часу, якое, незалежна ад абмежаванняў і забарон, друкавала матэрыялы м.інш. пра Царкву, пра прамоўчваныя імёны, узмацняючы дух беларускі не толькі на Беласточчыне. У падарунку „Ніва" атрымала ад незалежных беларускіх сіл фотаздымак з Плошчы Кастуся Каліноўскага „Застанемся", ад маладых беларусаў, не толькі для якіх „Ніва" была як „агмень свабоды, беларушчыны". „Хай жыве, хай жыве, хай жыве — у радасці і шчасці хай жыве!" — заспявала беларускую віншавальную забытую песню „Ніве" Галена Тапалянская з Трасцянкі.

Аб трывушчасці „Нівы" маглі сказаць перш за ўсё настаўнікі беларускай мовы, прыехаўшыя на наш залаты юбілей у Дзень настаўніка. Сярод іх ёсць і ніўскія карэспандэнты, і выхаваўцы нашых журналістаў — працуючых у рэдакцыі, і маладое пакаленне, а і самі яны маглі знайсці сябе як дзетак на старэнькіх здымках са сваіх школ у фотаальбоме „«Ніва» час і людзі 1956-2006". З вялікіх школ, ліцэяў, і вясковых школак, якія перасталі ўжо існаваць. А і з наймалодшым пакаленнем „Ніва" ідзе крок у крок, а і спераду. Наш фотаальбом уражвае аб'ёмістасцю, хоць выкарыстана толькі жменька здымкаў з выкананых нашымі хранікёрамі-вандроўцамі, што прайшлі кожную сцяжынку Беласточчыны. Паўстагоддзя — ладны кавалак часу, і шчасліва „Ніва" змагла ўвекавечыць і наш агульны лёс, і лёсы паасобных людзей. Ну дык падаследвалі, пасвяткавалі, пагулялі-паспявалі, і, памаліўшыся ў святога Міколы, — зноў за руплівую работу бярыся, ніўская сямейка! Журналісты, карэспандэнты, супрацоўнікі...

Міра ЛУКША

http://www.pushkin.by

Імя мастака Алеся Пушкіна добра вядомае не толькі беларускім майстрам пэндзля, але і людзям, якія не маюць да напісання карцін ніякага дачынення. Нягледзячы на мноства выдатных твораў, мастак шмат каму ўвайшоў у свядомасць сваімі вельмі арыгінальнымі ўчынкамі-пэрформансамі. Некаторыя з іх маюць выразны палітычны падтэкст. Дастаткова ўзгадаць пэрформанс, прысвечаны пяцігоддзю прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі, калі ў знак „падзякі за плённую прэзідэнцкую працу" мастак прыйшоў да будынка адміністрацыі прэзідэнта з тачкай гною, у які праз партрэт Лукашэнкі былі ўторкнуты звычайныя сялянскія вілы.

Але не толькі пэрформансамі славіцца незвычайны мастак. Яго аўтарству належыць мноства карцін, пазнаёміцца з якімі дазваляе сайт „Галерэя Алеся Пушкіна", які месціцца ў Інтэрнэце па адрасе http://www.pushkin.by.

Першая старонка сайта ў нечым нагадвае сапраўдную галерэю. Такое ўражанне ствараецца, калі бачыш падзеленае на тры часткі выяўленне, дзе на дзвюх крайніх размешчаныя выйсці да іншых рубрык, аздобленыя адпаведнымі карцінамі. Уверсе выяўлення фатаграфія самога мастака на фоне акна, з якога відаць дахі суседніх дамоў. Пасярэдзіне выяўлення на яго шырэйшай частцы месцяцца так званыя „Апошнія абнаўленні". Яны тычацца розных падзей з жыцця мастака, яго ўдзелу ў разнастайных выставах ці мастацкіх спатканнях.

Што ж тычыцца рубрык сайта, то першай і шматзначнай з'яўляецца рубрыка „Біяграфія, крытыка". Калі мы зазірнем на яе, то патрапім на вялікі тэкст, які ёсць вельмі падрабязным аўтабіяграфічным расповедам Алеся Пушкіна.

Наступная рубрыка называецца „Галерэя карцінаў". Арыгінальнай падачай тут можна лічыць тое, што гэтая „галерэя" падзяляецца на залы-гады. Першая зала ахоплівае перыяд 1988-1991 гадоў, а апошняя, шостая — ад 2001 да 2003. Адзіным недахопам гэтай старонкі ёсць адсутнасць на ёй твораў мастака за апошнія тры гады.

Алесь Пушкін лічыць сябе вельмі набожным чалавекам. Магчыма таму яго час ад часу запрашаюць распісваць цэрквы і касцёлы. Адным з найбольш нашумелых роспісаў стала афармленне царквы ў вёсцы Бобр, на малой радзіме мастака. Там маецца фрэска „Судны дзень", дзе сярод найбольшых грэшнікаў, намаляваных Пушкіным, выразна відаць постаці сучаснага беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і патрыяршага экзарха Беларусі мітрапаліта Філарэта. Гэтая фрэска ў свой час стала нагодай для адмысловага рэпартажу адной з расійскіх тэлепраграм.

У „Пэрформансах" маем магчымасць убачыць здымкі Алеся Пушкіна падчас іх выканання. Акрамя „Падарунка прэзідэнту", пра які ішла гаворка на пачатку артыкула, увагу віртуальнага наведвальніка галерэі прыцягваюць здымкі з пэрформансаў „Муза бобрскіх прастораў" і „Божа, барані Беларусь!"

Прыемным сюрпрызам для гасцей сайта становіцца выйсце да фільма пра творчасць мастака. Ягоная назва аналагічная назве данага сайта. Праўда, паглядзець цэлы фільм, аўтарам якога ёсць Ірына Волах, не ўдасца. Толькі 13 хвілін даступныя для наведвальнікаў сайта, камп'ютэры якіх маюць адпаведнае забеспячэнне. Жадаючым набыць фільм цалкам прапануецца звярнуцца ўласна да Алеся Пушкіна.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Залатая „рыбалка"

Беларускі штангіст Андрэй Рыбакоў, сярэбраны прызёр алімпійскіх гульняў у Афінах, стаў чэмпіёнам свету! Спаборніцтвы па выяўленні мацнейшых асілкаў праходзілі ў далёкай Дамініканскай Рэспубліцы.

Па выніках сусветнага першынства мужчынская каманда Беларусі размясцілася на пятай пазіцыі ў агульным заліку. Гэтая заваёва была дасягнута пры адсутнасці чэмпіёна свету Генадзя Алешчука (ветэран планава прапусціў заакіянскі топ-турнір). А жаночая беларуская дружына выступала ўвогуле ў моладзева-дублёрным складзе — не бралі ўдзел у чэмпіянаце нашы лідэркі Ганна Бацюшка і Тацяна Стукалава (абедзве алімпійскія прызёркі), а таксама ўжо тытулаваная Анастасія Новікава. Без іх айчынныя штангісткі ў агульнакамандавай класіфікацыі сталі дзесятымі.

Трэба зазначыць, што акрамя непасрэднага спабору на чэмпіянаце свету ішло размеркаванне алімпійскіх ліцэнзій на пекінскую алімпіяду 2008 года. Для таго, каб краіна атрымала максімальную квоту, мужчынам трэба ўвайсці ў першую шасцёрку, а жанчынам трапіць у лік дзевяці мацнейшых дружын. Аналагічны прынцып будзе дзейнічаць і на чэмпіянаце свету наступнага года, які пройдзе ў Тайландзе.

Поспех магілёўскага прадстаўніка Андрэя Рыбакова стаў абсалютным — ён „вывудзіў" у катэгорыі да 85 кілаграмаў усе тры залатыя медалі: у рыўку (180 кг), штуршку (203 кг) і адпаведна па суме двухбор'я (383 кг). У гэтай жа вагавай катэгорыі Беларусь магла займець яшчэ адзін медаль, але ў справу ўмяшалася „гульня пад дыванам". Чэмпіён сярод юніёраў Вадзім Стральцоў паказаў другі вынік, але расійская каманда падала пратэст на выкананне беларусам штуршка (вось вам і агульнаславянскае братэрства — такія дзеянні расійскіх прадстаўнікоў у дачыненні да суседзяў становяцца ўжо звыклымі). У выніку разгляду апеляцыйная камісія, у склад якой уваходзіў і прадстаўнік Расіі, выявіла ў выкананні беларуса тэхнічную памылку і анулявала яго вынік. Але нават пры такім суб'ектыўным рашэнні Стральцоў заняў высокае пятае месца — безумоўны поспех дэбютанта.

Што датычыць чэмпіёна Рыбакова, то доўгі час ягонай ахілесавай пятой было другое практыкаванне — штуршок. У рыўку магілёвец біў сусветныя рэкорды, а ў штуршку папросту не мог належна канкураваць з апанентамі. І вось бягучы год паказаў, што атлет пад кіраўніцтвам галоўнага трэнера зборнай Аляксандра Ганчарова зрабіў правільныя высновы ў час падрыхтоўчага працэсу. Пацвярджэннем таму не толькі вынікі чэмпіянату свету — яшчэ ў красавіку Рыбакоў упэўнена перамог на першынстве Еўропы (прычым тады ў суме падняў на 9 кілаграмаў болей).

А вось некаторыя іншыя штангісты моцна расчаравалі. У прыватнасці, дасведчаныя Мікалай Патоцкі і Міхаіл Аўдзееў не справіліся з першапачатковымі цяжарамі і атрымалі на чэмпіянаце свету нулявыя ацэнкі — на прафесійным слэнгу іх называюць „абаранкі". Цяпер усе надзеі на восеньскі чэмпіянат свету наступнага года. Хочацца верыць, што айчынныя асілкі выправяць сітуацыю. Ну а Рыбакоў, падобна на тое, мае шанцы ў бліжэйшым будучым стаць у шэраг вялікіх беларускіх чэмпіёнаў, такіх як Валерый Шарый, Леанід Тараненка, Аляксандр Курловіч.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Грамадства дыялогу

Тэма пачынаецца з размовы: чалавек з чалавекам, чалавек з культурай, культура з культурай, чалавек сам з сабою. Самае важнае, каб пытаць і сабе адказваць, каб прапанаваць, распавядаць, шукаць, магчыма паўстане дыялог.

Дыялог апошнім часам — папулярнае слова. Ці можам без яго суіснаваць? Як тое адбывалася ў мінулых стагоддзях? Навукоўцы прапануюць пачаць з тоеснасці ды вызначэння самога сябе. Яны паклоннікі пошукаў дэфініцый культуры, а нават самога дыялогу. Такім чынам паўстане даведачны дапаможнік, якім варта кіравацца ў жыцці. А яно нялёгкім стала, калі паявіліся нацыі ды нацыянальныя культуры. Галоўнае аднак, як кажуць спецыялісты, знайсці зразуменне сярод сваёй уласнай культуры, каб умець размаўляць са Сваім, а пасля апынуцца ў зыходным пункце да размовы з гэтым Іншым, часам зусім Чужым. Гэта агульныя заўвагі і высновы пасля дыскусіі-семінара ў Віле Дэцыя ў Кракаве, у якой прымалі ўдзел прадстаўнікі нацыянальных меншасцей і адначасова прадстаўнікі акадэмічнага жыцця, зацікаўленыя філасофіяй, тэорыямі культуры, цывілізацыі, сацыялогіяй. Сам семінар, наладжаны працаўнікамі Публічнай бібліятэкі пры нагодзе міжнароднай канферэнцыі „Грамадства дыялогу", аказаўся даволі цікавым, хаця не раскрыў галасоў меншасных асяроддзяў. Затое акадэмічны бок дыскусіі дазволіў на падрыхтоўку да зусім іншага дыялогу ў час згаданай канферэнцыі.

У праграме канферэнцыі знайшла я даклад грамадскага дзеяча ды адначасова кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Аляксандра Мілінкевіча. Зразумела было, што ў кантэксце ягонай дзейнасці прысутнасць на такой канферэнцыі не здзіўляе. Але яшчэ да „дыялагічных размоў" усе чакалі ўрачыстага моманту. Ад трох гадоў ужо ў Віле Дэцыя прысвойваецца ўзнагарода імя Сержыу Віейра ды Мелу[1] за дзейнасць у карысць мірнага суіснавання і садзейнічання грамадстваў, рэлігій, культур. Намінаваных да ўзнагароды было 8 чалавек і 24 арганізацыі. Камісія з 9 асоб рашыла ўзнагародзіць у гэтым годзе Фестываль яўрэйскай культуры ў Кракаве і Аляксандра Мілінкевіча — беларускага грамадскага лідэра — як сам пра сябе кажа. У абгрунтаванні намеснік Упаўнаважанага па правах грамадзяніна Станіслаў Троцюк адзначыў асабістае дачыненне Мілінкевіча да працэсу абароны правоў чалавека ў Беларусі, да пабудовы структур дэмакратычнага грамадства, яго дзейнасць у карысць захавання і абароны беларускай мовы ды якасці беларускай культуры. Сам Мілінкевіч сказаў: „Цяжка словамі перадаць, што адчуваю. Гэта падтрымка беларускай дэмакратыі (...). Беларусь мае цудоўныя традыцыі па суіснаванні культур і рэлігій. (...) Не за фатэлі, не за хлеб, якога часта не стае, ідзе барацьба, а за праўду і справядлівасць. Гэта мы мусім тое занесці Беларусі, але вашая салідарнасць вельмі важная". Лаўрэат стараўся гаварыць і пра важныя рэчы: пра малавядомую палякам гісторыю Беларусі, адказваючы на пытанні — пра свой погляд на сучасную сітуацыю ў Беларусі ды перспектывы апазіцыйнай дзейнасці, з задумлівасцю вяртаўся ў час гродзенскага дзяцінства.

Кандыдатуру Мілінкевіча прапанаваў ганаровы консул Бразіліі Павел Свідэрскі. Толькі ці ў Беларусі — апрача блізкіх і сяброў узнагароджанага — хтосьці даведаецца пра такое вылучэнне?

Сітуацыя ў свеце вельмі складаная — простая выснова, асабліва калі паслухаеш галасоў спецыялістаў па працэсах палітычных, сацыялагічных ці псіхалагічных перамен. Джон Палмер (Вялікабрытанія) расказваў пра цяжкасці ў самой Еўропе і Еўрапейскім Саюзе — гэта ж наш панадворак. Унні Вікан з Нарвегіі распавяла пра ганаровыя забойствы ў шведска-арабскіх сем'ях — у рамках скандынаўскай дэмакратыі. Зіяд Рауф расказаў таксама пра змаганне курдаў за самастойнасць народа і незалежнасць сваёй зямлі. Напрыканцы Гіраміцу Моры звярнуў увагу на сітуацыю бежанцаў ва ўсім свеце. Розныя людзі, розныя погляды, але і згода, што нялёгка ўдасканальваць свет. Лукашэнка надалей прэзідэнтам Беларусі, Паліткоўская ўжо не жыве. Дзе і як шукаць зразумення? Як пачаць дыялог?

Ілона КАРПЮК

[1] Сержыу Віейра ды Мелу (Sergio Vieira de Mello) — шматгадовы працаўнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, займаўся справамі міру ў свеце ды гуманітарнай дапамогай, актыўна дзейнічаў пры вырашэнні канфліктаў у Камбоджы, Бангладэшы, Ліване, ва Усходнім Тыморы, у афрыканскіх краінах. Загінуў тры гады таму ў бамбовым замаху ў Багдадзе.

Засталіся адны на чужыне

Са Славікам Лукашэвічам пазнаёміліся мы ў шасцідзесятых гадах, калі я з кінаперасоўкай заязджаў у Пашкоўшчыну. Аднавяскоўцы клічуць яго „Рускі". У сапраўднасці ён у Пашкоўшчыне нарадзіўся. Паслухайма затым яго аповед...

— Прадзед мой з-пад Херсона выходзіў. Калі царыца Кацярына стала даваць надзелы зямлі (па дзесяць гектараў на мужчыну), каб засяліць ураджайныя стэпы Казахстана, дык перасяліўся ён з Украіны ў сяло Вясёлаўка Булаеўскага раёна Паўночна-Казахстанскай вобласці. Там нарадзіўся наш дзядуля, Павел Лукашэвіч, затым мой бацька, Аляксей Паўлавіч.

Бабулька Параскева выходзіла з Пашкоўшчыны. Яе бацькамі былі Андрэй і Марыя Баравікі. Перад набліжаючымся нямецкім фронтам у 1915 годзе падаліся яны ў бежанства. Пасяліліся ў Паўночна-Казахстанскай вобласці. Там бабка Параскева пазнала свайго будучага мужа. Васемнаццаты год ёй паступіў, як згулялі вяселле. Дзядуля Павел у той час служыў у царскай арміі. У 1918 годзе нарадзіўся ў іх сын Аляксей, наш бацька, пасля — дачка Надзя.

Нестабільная сітуацыя і галадуха пасля рэвалюцыі заставілі бабулю вярнуцца ў Польшчу. Калі збіралася ў падарожжа, дзядулі Паўла не было яшчэ дома. Паехаў ён шукаць хлеба. Вярталася яна адна з дзеткамі. Было гэта ў 1922 годзе. Дачушка памерла ёй у час падарожжа на тыф, недзе пад Масквой. У Пашкоўшчыну прыехала адно з Алёшай. Дзядуля Павел, вярнуўшыся дамоў, падаўся за бабуляй, але на граніцы рускія яго не пусцілі. Бабка стала жыць разам са сваімі бацькамі на дзевяцігектарнай гаспадарцы. Нядрэнна ім жылося. Бацькі былі добрага здароўя, апрацоўвалі



Бацька Славіка, Аляксей Паўлавіч

гаспадарку, а бабка займалася кравецтвам і выхоўвала сына. У 1934 годзе Аляксей Паўлавіч ажаніўся з Анастасіяй, дзяўчынай з суседніх Градалёў. З гэтага сужонства было ў іх трох сыноў. Я лічыўся першародным (1936 года нараджэння), два гады пазней нарадзіўся Шурка, а ў 1941 годзе прыйшоў на свет Сярожа. Жылі мы супольна з бабчынымі бацькамі, значыць, прадзедамі. Разам апрацоўвалі гаспадарку. Пашкоўшчына ў час вайны пацярпела ад пажару. Засталіся адно чатыры апаленыя забудовы. Як праходзіў фронт, дык за Тапчыкаламі немцы паставілі „Тыгры", якія абстрэльвалі дарогу Кляшчэлі — Бельск. Мясцовае насельніцтва сядзела ў сховішчах. Ад снарада, які трапіў у адно такое сховішча, загінула каля дзесяці чалавек, у гэтым ліку сястра матулі з мужам і двума дзеткамі. Немцы, калі адступалі, мачалкамі падпальвалі хаты. Арцёма Глінку застрэлілі на панадворку, бо хацеў з хлява выпусціць жывёлу. Вёску Кошкі пагроза мінавала, бо адна немка была там замужам. Калі з'явіліся салдаты з мачалкамі, яна перагаварылася з імі і гэтыя адступілі.

Славік (першы злева) з сябрамі з леспрамгаса ў раёне горада Сяроў (да 1939 г. Надеждинск)

Пасля фронту па вёсках ездзілі агітатары і намаўлялі выязджаць у Савецкі Саюз. Бацька наш на такое рашыўся. Падставілі нам два таварныя вагоны на станцыі ў Рыгораўцах, у якія мы пагрузілі сваю маёмасць. Выязджалі мы ў лістападзе 1944 года. Прыехалі ў Полацк, затым пасяліліся ў вёсцы Баранава, пяць кіламетраў ад горада. Там мы сустракалі Новы год. Назначылі нам дом па былым уласаўцу. Адна руіна, у памяшканнях не было падлогі, холадам зацягала з усіх бакоў. Бацька афарміўся рабочым на чыгунцы ў Полацку. Намі займалася маці. Неўзабаве перасяліліся мы ў Лазоўку. Мясціна аказалася вялікай, з трыма ваеннымі гарадкамі. Аднойчы сустрэлі мы на вуліцы актывістку, якая рэкамендавала нам выезд у Саюз, але яна незнаёмкай прыкінулася. У Лазоўцы бацька купіў лазню. Для гэтай здзелкі вымушаны быў у Баранаве прадаць карову ды саматканыя дываны. Але яна непрыдатнай аказалася, бо неўзабаве пераехалі мы ў Глыбокае. Лазня засталася. Прыгожае было мястэчка, з двума азёрамі. Бацька афарміўся кладаўшчыком на бойні, а маці працавала ў інкубатары. І тут спаткала нас бяда. Бацька аказаўся няўдачнікам, дапусціўся велькай недастачы на складах. У час адсутнасці матулі ён прадаў усе рэчы з хаты, а сам падаўся ў невядомым напрамку. Маці, калі з работы вярнулася, адно рукамі пляснула. Засталіся мы адны на чужыне. Калі загаварылі, што можна вяртацца ў Польшчу, маці прадала каштоўнейшыя рэчы, каб здабыць грошы на білет. У 1948 годзе падаліся мы ў раён Брэста і пасяліліся ў Драгічынскім раёне, на калёніі вёскі Папіна. Побач праходзіў Дняпроўска-Бугскі канал. Маці працавала ў калгасе. У нас не было афіцыйных дакументаў. Атрымалі мы адно спраўку з месца пражывання.

Славік з дачкой Ірэнай і ягоная жонка Клаўдзія з дачкой Ленай (пачатак шасцідзесятых гадоў)

Выклікала нас бабулька Параскева з Пашкоўшчыны. Дамоў вярнуліся мы 18 чэрвеня 1955 года. На старой сядзібе жыла адна бабулька. З мужыкоў я лічыўся самым старэйшым. Год пазней я ажаніўся. Бабка Параскева запісала мне чатыры гектары поля, ад цесцяў у пасагу атрымаў чарговыя тры гектары. Разабралі мы бабуліну стадолу, далажылі крыху дзерава і пабудавалі дом. У 1958 годзе нарадзілася дачка Ірэна, год пазней — Лена. Праз некалькі год наша сям'я пабольшала на дзве дзяўчынкі — Марыю (1962 г.) і Яўгенію (1964 г.). Паколькі жонка, Клаўдзія, займалася дочкамі, я апрацоўваў гаспадарку. Адначасова падаўся я на курсы трактарыстаў, а як атрымаў вадзіцельскія правы, пачаў працаваць у мясцовым СКРы. Было гэта ў сямідзесятыя гады. Калі ў Пашкоўшчыне арганізавалі калгас, я туды перайшоў на работу і тры гады працаваў трактарыстам. Калгаснікі не дбалі пра супольную маёмасць, кралі што далося. Вярнуўся я на ранейшую пасаду трактарыста ў СКР. Закончыў я курс камбайнераў. Да пенсіённага ўзросту працаваў я ў СКРы. У 1986 годзе памерла жонка. Адзінока займаўся я выхоўваннем дачок і задбаў пра іхнюю адукацыю. Зараз усе замужнія. Дачакаўся я дзесяці ўнукаў, а праўнукаў не змагу палічыць. Дзесяць гадоў я ўжо на пенсіі. Жыву адзінока, часам наведваюць мяне дочкі з унукамі. Успамінаю ім сваё дзяцінства, расказваю пра нашы карані, якія выходзяць з далёкага Казахстана.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Вячаслаў Лукашэвіч

Уладзімір СІДАРУК
Фота з архіва Вячаслава ЛУКАШЭВІЧА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1536 egz.

Суседскія былі

Куля

Сямён Трацяк, па мянушцы Нос, якую яму далі не толькі з-за таго, што ён любіў сунуць гэтую частку галавы ў чужыя справы, як гэта не парадаксальна, вельмі не любіў, калі ў яго асабістае жыццё зазірае хтосьці іншы. Ён быў такі сакрэтны, што барані Божа. Такіх патаемных свет не бачыў. Яму б з гэтым талентам у шпіёны куды ўладкавацца. І грошы добрыя зарабіў бы, і карысць якую Радзіме прынёс. Ды дзе там. Нос ні на каго не працаваў і не збіраўся. Жыў сваім розумам і сам для сябе. Ну яшчэ пра сям'ю не забываўся. Таму і ўладкаваўся на калгасную свінаферму вартаўніком, нібыта працаваць. А насамрэч, каб было дзе мукі ды буракоў сцягнуць для сваіх парсючкоў. Тым і зарабляў на жыццё. І зарабляў не горш за іншых, якія пупы дзерлі ды спіны гнулі на калгасным полі ды нічога за гэта не атрымлівалі. Хіба з тае бяды і залівалі па вечарах свой гаротны лёс моцнай вадкасцю ўласнай вытворчасці. А Нос амаль зусім гэтае паскудства не ўжываў. Хіба што на вялікае свята. Мужчына ён быў працавіты, калі для сябе, работы не баяўся. Жыў пераважна ўласнай гаспадаркай ды сваім розумам. Сам у сабе. Іншых у свае думкі не ўпускаў. А вось падслухаць дзе хто нешта тут ён не праміне. Яму яшчэ пасавала б мянушка Вуха.

Жонка Трацяка, Ганна, мужам была задаволена. Ну і што, што ён нелюдзень і негаваркі. Затое заўсёды пры хаце, не тое што іншыя лайдакі. Абы толькі да піўнога бара далезці і налізацца, як кот валяр'янкі. А пасля ўжо самастойна і дахаты дапаўзці не могуць без перапынкаў на трох- ці чатырохгадзінны сон пад адкрытым небам у цяні бэзаў. І тое, што людзі ейнага мужа недалюблівалі, яе мала хвалявала. Абы ёй было добра. А людзі — пляваць ім на грудзі.

Ды людзі праўду кажуць: увесь час добра не бывае. Не для таго жыццё чалавеку дадзена, каб ім цешыцца. А ў ціхім балоце, якім доўгі час быў яе муж, як вядома, чэрці водзяцца. Стала Ганна заўважаць, што яе законны і каханы стаў пазней дахаты прыходзіць з фермы. Часам нават добра налізаўшыся, аж на нагах стаяць не мог. Палезлі жанчыне ў галаву дурныя думкі. Можа ўцягнуўся ў нядобрую алкагольную кампанію, а можа, што яшчэ горш, з якой свінаркай зблытаўся там, на ферме. Бабы зараз такія пайшлі, кожнага мужыка схопяць. Не паглядзяць, што ў таго нос як у чорта. І людзей не засаромяцца. Маці Ганны паспрабавала супакоіць дачку. Кажа, чаго гэта яна ўжо думае пра самае горшае. Можа Нос проста папаўся на крадзяжы і цяпер выпівае з нерваў, бо хутка пасадзяць у турму. Гэтыя аргументы на нейкі час супакоілі Ганну, але пасля зноў сталі мроіцца чужыя жанчыны. Аж сардэчныя кроплі прыйшлося прымаць па начах. А як тут праўды дазнаешся. Яе ж каханы такі сакрэтны, што нават пра другіх людзей, пра якіх з-за сваіх якасцяў падслухоўваць ды падглядваць ведаў усё, нікому ніколі і нічога не выдаваў.

Пасохшы з тае роспачы месяц-другі, вырашыла кабета дзейнічаць наўпрост. Узяла неяк і прама ў лоб паставіла мужу ультыматум, каб той, калі дзе збіраецца затрымлівацца, то толькі з яе ведама і згоды. Назаўтра Нос прыйшоў дахаты са стрэльбай і паведаміў сваёй каханай, што ён стаў паляўнічым і зараз кожны вечар з яе згоды будзе ганяцца за ляснымі істотамі, якіх можна ўжываць у якасці ежы.

Ганна спачатку нічога кепскага не западозрыла. Хай, думае, гойдаецца сабе па лесе. Гэта ж лепш чым гарэлку піць з мясцовымі лайдакамі ці, о Божа, нават думаць страшна, звязвацца з тымі свінаркамі. Але пазней сталі да яе далятаць чуткі, што яе Сямён час ад часу купляе ў Грышкі Спірыды трусоў. Жанчына ледзь не абамлела. Стала ўспамінаць, як яе муж, прыйшоўшы з палявання, ганарліва кідаў на стол зайца, але чамусьці без шкуры. Казаў, шкуру так шротам пабіла, што мусіў выкінуць. А пасля, седзячы за сталом, нібыта даставаў з прыгатаванага зайца шрот, хоць самой Ганне той шрот ніколі на зубы не трапляўся.

Занепакоеная жанчына палезла патаемна ў кішэні мужа, у паляўнічую торбу, у стрэльбу зазірнула. Нідзе патронаў няма. А каханы ўсё зайцоў з палявання прыносіць. Адно слова — снайпер. Нават без патронаў б'е без промаху.

Набыла недзе Ганна кулю ад аўтамата Калашнікава і, смажачы чарговага зайца, упхнула яе ў мяса. Падала ежу мужу і назірае. А той, расказваючы, як ён заваліў шэранькага адным меткім стрэлам, сціснуў сківіцу і з крыкам выплюнуў на падлогу тры зламаныя зубы разам з куляй. Праз хвіліну і вочы ў яго ледзьве не выкаціліся да тых зубоў, калі здзіўлена глядзеў на кулю. А Ганна толькі папрасіла прабачэння, што не здагадалася, што пасля снайперскага мужавага стрэлу трэба было перад прыгатаваннем дастаць са здабычы кулю.

Больш Нос на паляванне не хадзіў. Стрэльбу іржа паела. Затое ў хаце зноў лад, парадак і шчаслівая жонка. Шчаслівай можна быць і пры бяззубым мужу. Адзіны хто застаўся абдзелены, гэта Грышка Спірыда. Прыйшлося кінуць разводзіць трусоў. Ніхто не купляе. Каму яны цяпер патрэбны.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Жыльбера Себрона.

1. шпень або тонкі вал, на якім трымаюцца колы, часткі машын або механізмаў = 27 _ 26 _ 3 _ 18 _;
2. рака, якая ўліваецца ў Балхаш = 2 _ 17 _ 10 _;
3. уліваецца ў Сож у Гомелі = 32 _ 9 _ 12 _ 13 _ 14 _;
4. замазка для акон = 19 _ 20 _ 25 _;
5. плоскія драўляныя палазкі прымацаваныя да абутку для пераміяшчэння па снезе = 31 _ 30 _ 29 _ 28 _;
6. кіргізскі горад у Ферганскай даліне = 5 _ 11 _;
7. старажытнаегіпецкі бог Месяца і мудрасці, лічыўся вынаходцам іерагліфаў = 15 _ 16 _ 4 _;
8. правінцыя ў Аўстрыі з цэнтрам у Грацы = 24 _ 21 _ 22 _ 6 _ 7 _ 23 _;
9. рэчка ў Расіі на ўсходзе Валагодскай вобласці = 8 _ 1 _.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 38 нумара

Авёс, вецер, дзевяць, душа, ежа, каза, Кігалі, код, лоцыя, сіта, Тога, цана, чума, шоўк.

Рашэнне: **Чалавек, які гаворыць усё што думае, нагадвае дзіця, што засікаецца ў ложак.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

29.10 – 04.11

Баран (21.03. — 19.04.) Прадбачваюцца канфлікты з супрацоўнікамі. Пастарайся нічога ў гэты час не ставіць рубам. Калі твой поспех будзе несумненна відавочным, закрыеш рот сваім сапернікам. Файныя рандэву. Даеш людзям пачуццё бяспекі.

Бык (20.04. — 20.05.) Чорныя хмары павіснуць над тваім адным сяброўствам. Адкрываюцца новыя шанцы тваёй кар'еры. Можаш адкрыць другую натуру партнёра. Можаш быць суровы для дзяцей і сяброў, ды ўсім будзе гэта да дабра.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Праблемы ў падарожжах, недахоп імпульсаў для працы. Зважай, каб не падпасці кіраўніку. У пастаянных парах — абавязкі і штодзённыя турботы; старайся, каб малаважныя справы не засланілі найважнейшага.

Рак (22.06. — 22.07.) Агромны пералом для Ракаў, у якіх не было поспехаў у любоўнай справе. Проста ззянне ў пачуццях! Ды можаш пазнаёміцца з кімсьці, але гэтае знаёмства не прынясе табе дабра. Грошы ашчаджвай, каб пасля не дрыжаць за кожны злот.

Леў (23.07. — 22.08.) Будзь вельмі асцярожны, прыглядайся дэталям — кожная хіба будзе мець непрыемныя паслядоўнасці. Львам з 14-19.08. прадбачваюцца высілкі і адмаўленні, але і вялікі поспех. Вельмі добры час на сардэчныя справы.

Дзева (23.08. — 22.09.) Шукаючы прынца з казкі, можаш трапіць зноў у тыя самыя абдымкі. Канец з падціскам пояса — твой кашалёк так патаўсцее, што цяжка будзе яго зашпіліць! Шмат з планаў удасца ажыццявіць, але прыйдзецца заплаціць высокую цану.

Шалі (23.09. — 22.10.) Не спрыяе шчасце ў каханні. Будзеце адны з адным моцна раніць сябе, а калі вырашыце аб расстанні, будзе гэта яшчэ больш балюча. Рой нагод падзарабіць.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Ты рушыў проста галопам! Ніхто цябе не падвядзе і не напалохае. Зрэалізуеш усе планы, схіліш да сябе людзей. Пераканаеш супрацоўнікаў да сваіх планаў. Можаш уступіцца ў тую самую раку — пагаслыя пачуцці выбухнуць з падвойнай сілай.

Стралец (22.11. — 21.12.) Добры час для навукі, штудзіравання, вывучэння іншаземных моў. Абдумай пару спраў спакойна, не ўлазь у не сваё. Выберыся самотна ў лес. Паміж табой і кімсьці з сяброўак можа выбухнуць каханне. Хтосьці знаёмы можа цябе падвесці.

Казярог (22.12. — 19.01.) Крыху памутнее твая радасць ад уплыву Ліліт — будзе цяжэй у асабістых справах. Выключную радасць нясуць кантакты з сапраўды блізкімі табе людзьмі. З сябрамі выберыся на сустрэчу, супольную імпрэзу. Надта ж многа ўсялякіх навінак.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Далей спраўна спалучаеш асабістыя амбіцыі з ростам багацця. Ды будуць клопаты са здароўем — можаш пакалечыцца, штосьці разбіць, асабліва галаву ці калені.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Найбольш дзвярэй адчыняе веданне моў. Магчымыя вялікія грошы — быццам з неба! Лёгка дагаворышся з жанчынамі, асабліва моцнымі, з характарам. Зоркі гарантуюць знакамітыя вынікі ад дыет і фізкультуры.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960